СОНЦА:
Усход, заход, даўжыня дня:
Мінск — 7.08, 17.38, 10.30;
Віцебск — 7.01, 17.25, 10.24;
Магілёў — 6.58, 17.27, 10.29;
Гомель — 6.52, 17.27, 10.35;
Гродна — 7.23, 17.53, 10.30;
Брэст — 7.31, 17.57, 10.36.

МЕСЯЦ:
Апошняя квадра 25 лютага.

ІМЯНІНЫ
Аляксея, Мары, Яўгена, Антона; Віктара, Цэзара

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 75 кап.

25 ЛЮТАГА 1992 г. аўторак, №№ 39—40 (21817—21818)

РозгАЛАС

БСДГ І ГРАНІТ НАВУКІ

На пленуме Цэнтральнай рады Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады абмяркавана пытанне аб стане беларускай навукі, пачынаючы з ваеннай і канчаючы сельскагаспадарчай.

Прынята пастанова, у якой фракцыі БСДГ у Вярхоўным Савеце рэспублікі даручана ўзняць на веснавой сесіі пытанне аб падвышэнні [illegible] звярнуць увагу парламентарыяў на стан ваеннай навукі і на прыярытэты ў яе фінансаванні.

Апрача таго, на пленуме ўхвалена рашэнне выканкома БСДГ аб пералічэнні на падрыхтоўку Усебеларускага рэферэндуму 5 тысяч рублёў з бюджэту партыі.

БелаПАН.

ДОЛАРЫ—З АРЭНДЫ, РУБЛІ—З ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

Як паведаміла газета «Брестский курьер», 9.950 долараў паступіла ў мінулым годзе на гарвыканкамаўскі рахунак за здадзеныя ў арэнду плошчы.

Плануецца, што сёлета гэта лічба ўзрасце да 156 тысяч долараў.

У горадзе таксама прыватызавана 2.086 кватэр, з якіх 947 — на льготных умовах. У гарадскую казну паступіла 4 мільёны 396 тысяч рублёў. [illegible]

БелаПАН.

ХОЧАШ КУРЫЦЬ? САДЖАЙ ТЫТУНЬ...

ПІНСКІ РАЁН. Тытунёвы крызіс прымусіў мясцовых ўладаў пайсці на канкрэтныя практычныя меры. Рашэннем сесіі райсавета рэкамендавана калгасам, саўгасам, фермерскім і сялянскім гаспадаркам арганізаваць вырошчванне тытуню на сваіх участках. Спецыялісты РАПА ўжо [illegible] зараз насенне лепшых гатункаў, у бліжэйшы час будзе праведзены спецыяльны семінар для тых, хто хоча заняцца гэтай справай. З Гродзенскай тытунёвай фабрыкай заключаны дагавор аб пастаўцы тытуню сыравіны ў абмен на гатовыя цыгарэты.

ДАЙЦЕ МЕДЫКАМ ЖЫЛЛЁ

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ. Вялікая нагрузка сёння ў медыцынскага персаналу Гомельшчыны. Галоўная прычына вядома — шмат работы ў сувязі з чарнобыльскай аварыяй. З-за гэтага многія ўрачы выехалі за межы вобласці [illegible]

Жыхары зоны жорсткага кантролю з-за гэтых і іншых прычын [illegible] медыцынскую дапамогу. Ды і як можна атрымаць яе, калі, скажам, у Хойніцкім раёне працуе ўсяго 1 (адзін!) хірург, а ў абласным цэнтры ў чарзе на атрыманне жылля стаяць 465 медыкаў, а 320 маладых спецыялістаў з-за адсутнасці кватэр гатовы выехаць працаваць у іншыя рэгіёны.

За апошнія [illegible] медыкам горада была выдзелена толькі адна кватэра. Становішча, як бачым, трывожнае. Таму на [illegible] сесіі гарсавета было вырашана звярнуцца ў Савет Міністраў РБ з просьбай [illegible]

РАЗМЕРКАВАННЕ ПА «КВАТЭРАХ»

Гэта навіна імгненна абляцела Брагін: [illegible] Людміла Рудзеняк. [illegible]

На 40 тысяч рублёў [illegible] галоўнай медсястры. [illegible]

АКЦЫЯНЕРЫ ПАДСУМОЎВАЮЦЬ

ЧАШНІКІ (У. Гойтан). Адбылася канферэнцыя аграпрамысловага акцыянернага таварыства «Чашнікі».

Хоць, як адзначыў старшыня праўлення Мікалай [illegible], мінула каля паўгода з дня яго стварэння, ёсць ужо першыя набыткі. Цяпер таварыства аб'ядноўвае больш за 20 прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, арганізацый. Сярод іх завод керамзітавага гравію, папяровая фабрыка «Чырвоная зорка», камбінат [illegible] тавараў, [illegible]. Сюды ж уваходзяць і дзве гаспадаркі з суседняга Лепельскага раёна, а таксама раённы Аграпрамбанк і Беларускі [illegible] банк, шэраг малых прадпрыемстваў. За гэты час рэалізавана акцый больш як на 900 тысяч рублёў. Карыстаючыся магчымасцю выхаду на біржы, таварыства змагло закупіць для гаспадарак розных тавараў больш як на 700 тысяч рублёў. Адкрыты свой фірменны магазін. Робяцца першыя крокі па арганізацыі перапрацоўкі сельгаспрадукцыі. Праяўляюць зацікаўленасць у супрацоўніцтве з таварыствам і мясцовыя фермеры. Іх перш за ўсё прывабліваe магчымасць набыць тэхніку, будаўнічыя матэрыялы. Таварыства займаецца і дабрачыннай дзейнасцю: частка сродкаў нядаўна пералічана на рахунак фонда сацыяльнай абароны былых ваеннаслужачых.

ЗАПАЛ ЯШЧЭ ЁСЦЬ

МАГІЛЁЎ (А. Санчук). Савецкая плошча абласнога цэнтра бачыла нямала мітынгаў, мнагалюдных і не вельмі. Апошні, што адбыўся ў мінулую нядзелю па ініцыятыве мясцовай арганізацыі БНФ у падтрымку рэферэндуму, да надта масавых не аднясеш. Але ён паказаў, што ў магілёўчан яшчэ ёсць мітынговы запал.

Прамоўцамі былі ў асноўным тутэйшыя актывісты палітычных партый і рухаў. Яны выказваліся за адстаўку Вярхоўнага Савета і датэрміновыя выбары на падставе новага закона. Падтрымаць правядзенне рэферэндуму па гэтаму пытанню заклікаў і народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Леанід Звераў. Такое ж патрабаванне ўтрымліваецца ў прынятай на мітынгу рэзалюцыі.

ПРАМОВЫ ЗАМЯНІЛІ ПЕСНЯМІ

Любімыя песні замест сумных прамоў пачулі ўдзельнікі святочнага вечара, прысвечанага Дню Узброеных Сіл. Ён адбыўся 21 лютага ў Мінскім доме афіцэраў. У паўзах паміж канцэртнымі нумарамі з цёплымі словамі прывітання да воінаў і гасцей звярнуліся камандуючы войскамі БВА генерал-палкоўнік Анатоль Кастэнка, старшыня Мінскага гарсавета народных дэпутатаў Аляксандр Герасіменка, генерал-маёр запасу Аляксей Чацвяроў.

Госцем вечара быў Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі Станіслаў Шушкевіч.

АЛЬЯНС ПРАМЫСЛОЎЦАЎ І БІЗНЕСМЕНАЎ

Адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Магілёўскай прамыслова-гандлёвай палаты. Яе заснавалі кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і найбольш моцных структур прыватнага сектара эканомікі як грамадскую некамерцыйную арганізацыю. Гэта першы афіцыяльны альянс прамыслоўцаў і бізнесменаў у нашай рэспубліцы.

Яны аб'ядналіся перад небяспекай вострага крызісу, але не толькі для таго, каб проста выжыць, разам пераадольваючы яго цяжкасці. Адну з галоўных задач палаты яе заснавальнікі бачаць у наладжванні ўзаемадзеяння дзелавых колаў з органамі ўлады, у тым ліку і ўдзел у распрацоўцы эканамічнага заканадаўства. Новая арганізацыя і сама будзе рэальнай уладай у рэгіёне, аказваючы ўплыў на яго сацыяльна-эканамічнае становішча і палітычнае жыццё. Тым больш, што палата ўзнікла не на пустым месцы, а стала правапераемніцай Магілёўскага савета дырэктараў, які ўжо меў немалы вопыт эфектыўнай дзейнасці.

Прэзідэнтам прамыслова-гандлёвай палаты выбраны дырэктар завода «Магілёўсельмаш» Валерый Чарткоў, віцэ-прэзідэнтам — старшыня праўлення кааператыва «Уніка» Юрый Падольскі. Працаваць яны будуць на грамадскіх асновах. Але разам з тым ствараецца і выканаўчая дырэкцыя палаты са штатам кваліфікаваных менеджэраў.

Аляксандр САНЧУК.

ВІЗАВЫ РЭЖЫМ НА УКРАІНЕ

Толькі пры наяўнасці ўкраінскай візы змогуць наведваць Украіну грамадзяне Польшчы.

Агенцтва ПАП, якое распаўсюдзіла гэта паведамленне, спасылаючыся на Міністэрства замежных спраў Украіны, указвае, што чужаземцам ужо выдаюцца ўязныя візы тэрмінам на сем дзён прама на пагранічных пераходах з Расіяй, Беларуссю, Польшчай, Венгрыяй, Чэха-Славакіяй, Румыніяй, а таксама ў аэрапортах Кіева, Львова, Ялты і Сімферопаля. Пры неабходнасці іх можна будзе прадоўжваць па месцы знаходжання. Спецыяльнае запрашэнне ў госці ад жыхароў Украіны для гэтага не патрабуецца. Дастаткова ўнесці дадатковую плату ў канверсуемай валюце.

22 лютага пад гукі ваеннага аркестра былі ўскладзены да абеліска на плошчы Перамогі вянкі ад Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі, Савета Міністраў рэспублікі, ваеннага савета БВА, ветэранаў вайны, Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, калектываў прадпрыемстваў горада. Аддаючы даніну мужнасці і гераізму абаронцаў Айчыны, урачыстым маршам на плошчы Перамогі ў парадным страі прайшла рота ганаровай варты Мінскага гарнізона.

Кветкі і вянкі ў гэты дзень былі ўскладзены да брацкіх магіл, на воінскіх могілках і мемарыялах ва ўсіх гарадах і вёсках Беларусі.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

Мітынгаў—многа, цяжкасці—адны

СВЯТА З ГІСТОРЫІ?

Такога мінчане не бачылі, мабыць, са жніўня мінулага года, калі КПБ была дэмаралізавана і не магла збіраць сваіх прыхільнікаў на масавыя мерапрыемствы. Дык вось, тое, што не магла КПБ, пачынае рабіць ДСПС (Рух «За дэмакратыю, сацыяльны прагрэс і справядлівасць»). У нядзелю, 23 лютага, у мінскім парку імя Горкага ён наладзіў мітынг, прысвечаны 74-й гадавіне Савецкай Арміі. На ім усё было, як заўсёды ў гэты дзень на працягу існавання Савецкага Саюза, развяваліся сцягі СССР і БССР, гучалі іх гімны, словы аб непарушнасці арміі і народа. Праўда, час унёс карэктывы і ў гэта свята. Асноўнымі матывамі літаральна ўсіх выступленняў было — не дапусціць расцягвання арміі па нацыянальных кватэрах, не ператварыць яе ў закладніцу міжнацыянальных канфліктаў, забяспечыць сацыяльную абароненасць ваеннаслужачых.

На мітынгу гучалі добрыя песні часоў Вялікай Айчыннай вайны, а думкі сівых людзей, якія перажылі і ГУЛАГ, і вайну, і галодную пасляваенную разруху і тым не менш лічаць сваё жыццё шчаслівым — менавіта яны прыйшлі на мітынг — іх думкі былі скіраваны да магутнай дзяржавы СССР, без якой яны сябе не ўяўляюць і без якой ні Беларусі, ні Расіі, ні Літве не пражыць. Думкі і прапановы абсалютна натуральныя для ўдзельнікаў мітынгу, але вельмі не хацелася б, каб нехта вырашыў: калі гэта свята масава адзначаюць толькі ветэраны, то яно для народа не патрэбна. Бо пакуль няма іншага дня для ўшанавання вайскоўцаў, будзем рабіць гэта 23 лютага. Ім ёсць за што сказаць дзякуй!

ГАРАНТЫ ПЕРАМЕН — МЫ САМІ

Мітынг у падтрымку рэферэндуму на плошчы Незалежнасці пачаўся невялікай, не многімі заўважанай падзеяй, якая мяне надта парадавала: у імгненне вока разыходзіліся кніжкі, што прынёс сталы чалавек зусім не гандлярскага выгляду. Куплялі не зборнікі анекдотаў, не дэтэктывы і прыгоды Анжэлікі, якімі нас нярэдка заваблівалі на ўсялякія ідэалагічна-пустыя нарады не ў такія ўжо далёкія часы. Людзі куплялі «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» Усевалада Ігнатоўскага. Некалькі запакаваных у тоўстую паперу стосаў зніклі за лічаныя хвіліны. Значыць, недарэмна прайшлі гады гукання нашае нацыянальнае памяці, беларускай душы. Значыць, адгукнулася.

А мітынгоўцы менавіта з гэтага і пачалі свой сход — згадалі надзеі, што няўхільна вялі да перамен у людской свядомасці. Ад памятнага мітынгу на стадыёне «Дынама» да таго дня, калі «спадара Сакалова прымусілі зняць шапку перад народам».

Спадара Сакалова, а таксама ягоных наступнікаў і саратнікаў даўно ўжо няма каля дзяржаўнага руля, а жыць лепей, на жаль, не стала. Зніклі з лозунгаў пратэсту прозвішчы ўсіх па чарзе камуністычных кіраўнікоў рэспублікі, маем кіраўнікоў дэмакратычных, а перамен — мала. Чаму? Чаму народ працуе, а жыве ўсё горш?!

— Таму што сённяшняя наша ўлада, — гаварыў Юрась Хадыка, — па форме дэмакратычная, а па сутнасці засталася той жа, спрацаванай па камуністычных шаблонах, у многіх выпадках па-ранейшаму належыць учарашняй наменклатуры. Раней яны валодалі ўладай, а цяпер валодаюць нашым жыццём — праз эканоміку. Ідзе разарэнне народа — праз павышэнне цэн без увядзення іншых атрыбутаў рынку.

Прамоўцу падтрымаў і народны дэпутат Беларусі Лявон Баршчэўскі. Ён прапанаваў сходу ўважліва паназіраць, на каго працуюць сённяшнія ўладныя структуры. Яны разумеюць, што доўга не пратрымаюцца на ўладных вышынях, а таму робяць усё, каб забяспечыць сабе будучыню цяпер. Рэспублікай кіраваць цяжка, гэтая работа патрабуе самаахвяравання, але вельмі многія замест яе заняліся падграбаннем пад сябе.

І гэты працэс, адзначалася на мітынгу, куды больш небяспечны, чым ранейшыя інтрыгі ў кіраўніцкіх кабінетах, калі ў любы момант можна было апынуцца адціснутым з той альбо іншай пасады і застацца ні з чым. Цяпер учарашнія «блюстители принципов» памянялі тактыку: адкінуўшы ранейшыя—і ўсялякія—прынцыпы, не спадзеючыся на ілюзорную палітычную ўладу, стаўку робяць на ўладу рэальную: авалодванне пэўным маёмасным грунтам. Гэта зрабіць не так і цяжка, маючы адпаведныя сувязі, навыкі і хватку. Таму і не спяшаюцца з рэформамі, адцягваюць прыняцце радыкальных рашэнняў. На думку Зянона Пазняка, ідзе працэс перапампоўвання народных сродкаў ва ўласныя, што прывядзе да ажыццяўлення тактыкі: кучка багацеяў і голы народ. Сёмы год вядуцца размовы аб рынку, але пакуль што ўсё робіцца на карысць толькі пэўных колаў. Адміністрацыйным парадкам у рынachныя схемы ўстаўляюцца асобныя элементы, у выніку чаго маем шалёную спекуляцыю, мафію. Калі працэс своечасова не спыніць, то ніякай уладзе, нават самай дэмакратычнай, не ўдасца авалодаць становішчам. Вось чаму патрэбна змена такой улады. А адзіным цывілізаваным шляхам да гэтага з'яўляецца рэферэндум, затым — новыя выбары.

Але ці будзе гарантыя, задаваўся пытаннем Вінцук Вячорка, што ў працэсе новых выбараў адных аматараў «кармушкі» не зменяць іншыя, і ўсё зноў пойдзе па старому сцэнарыю? Заслону павінен паставіць новы Закон аб выбарах, які дазволіць мець акругі буйнейшыя, чым сённяшнія раёны, дзе даўно склаліся трывалыя бюракратычныя сувязі. Толькі самі людзі, збаўленыя ад адміністрацыйна-бюракратычнага дыктату, змогуць вызначыць дастойных.

Мітынг прымае рэзалюцыю ў падтрымку рэферэндуму.

Былі і падзеі, што нагадвалі пра дзень, у які адбыўся мітынг, — 23 лютага, калі мы традыцыйна святкавалі дзень Савецкай Арміі. Адстаўнік флоту паспрабаваў павесці гаворку пра вернасць воінскай прысязе, дадзенай быламу Саюзу ССР, і супраць таго, каб войска прысягала сваім нацыянальным дзяржавам. Рэакцыю мітынгу чытачы могуць сабе ўявіць. Услед за гэтым капітан другога рангу Някрасаў, які служыць на падводнай лодцы, расказаў аб тэндэнцыях, што назіраюцца ў войску: распродаж з малатка маёмасці флоту і арміі, узбагачэнне армейскай вярхушкі. Падпалкоўнік Лебедзеў праспяваў песню.

Кар. «Звязды».
Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

С. Шушкевіч дае інтэрв'ю французскай «Монд»

«Апошняя нарада кіраўнікоў рэспублік — членаў СНД не была правалам», — заяўляе Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч у інтэрв'ю, апублікаваным 22 лютага французскай газетай «Монд». Зроблена нават больш, чым чакалася — падпісаны 16 пагадненняў. У ходзе сустрэчы былі ўрэгуляваны асноўныя праблемы, удакладнена пагадненне аб ядзерных сілах. Уся тактычная ядзерная зброя будзе выведзена з беларускай зямлі да 1 ліпеня. «Мы хацелі б дзейнічаць хутчэй, але гэта немагчыма». Таму тэрмін два гады, на працягу якога ўсе стратэгічныя ракеты павінны быць вывезены з Беларусі ў Расію, выглядае «няпэўным», лічыць беларускі кіраўнік.

Як адзначае газета, С. Шушкевіч — адзіны пакуль што дзяржаўны лідэр у СНД, які асмеліўся сказаць, што яго рэспубліка мае незалежнасць толькі «ў прынцыпе». «Але да канца гэтага тысячагоддзя ніхто не будзе сумнявацца, што Беларусь сапраўды існуе» як незалежная дзяржава, адзначыў ён. «Мы ідзём да незалежнасці, але не ўяўляем сабе нават у доўгатэрміновай перспектыве такога расколу з Расіяй, які можа сабе дазволіць Украіна», таму неабходна пераканаць расійскае кіраўніцтва ў тым, што суверэнітэт Беларусі не супярэчыць інтарэсам Расіі.

У цэлым палітычны курс беларускага кіраўніка можна ахарактарызаваць як умераны, лічыць «Монд». Хоць апазіцыя крытыкуе яго за «супрацоўніцтва з кансерватыўным парламентам», яе члены прызнаюць сумленнасць і прыстойнасць С. Шушкевіча. Гаворачы аб праблемах узаемадзеяння з рознымі палітычнымі сіламі рэспублікі, ён адзначыў, што Беларусь не збіраецца браць прыклад з Украіны і «разыгрываць нацыяналістычную карту». Што ж датычыць парламента, то «гэты «рэакцыйны» парламент прыняў даволі прагрэсіўныя законы».

Гаворачы аб магчымасці ўвядзення ўласнай валюты ў рэспубліцы, С. Шушкевіч заявіў, што «зробіць усё магчымае, каб пазбегнуць гэтага». Што ж датычыць перспектыў пераарыентацыі эканомікі рэспублікі на Захад, у прыватнасці, узмацнення сувязей з Польшчай, ЧСФР, Венгрыяй, то такое развіццё падзей зусім верагоднае, але запатрабуе значных намаганняў. «70 працэнтаў нашай прадукцыі ідзе ў Расію і іншыя рэспублікі былога Савецкага Саюза»,— падкрэсліў Старшыня Вярхоўнага Савета.

Каменціруючы пытанне аб узброеных сілах былога Савецкага Саюза, беларускі кіраўнік ясна даў зразумець, што яго рэспубліка не будзе ўдзельнічаць у аб'яднаных узброеных сілах СНД. На працягу двухгадовага пераходнага перыяду будзе створана беларуская армія колькасцю 50—60 тысяч чалавек.

В. КЕБІЧ АБ СІТУАЦЫІ Ў ЭКАНОМІЦЫ

Мы паведамлялі ўжо аб сустрэчы ў мінулую пятніцу кіраўніка Савета Міністраў рэспублікі з групай старшынь райсаветаў і работнікаў выканкомаў сельскіх раёнаў. У сваім гадзінным выступленні В. Кебіч даволі грунтоўна прааналізаваў стан эканомікі Беларусі. Вось асноўныя пазіцыі яго прамовы.

Адзін з самых дэстабілізуючых момантаў — невыкананне заключаных паміж краінамі СНД пагадненняў, у тым ліку Беларусі з Расіяй. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што Расія вырашыла ў першую чаргу задавальняць свае патрэбы, а толькі што застанецца — вывозіць за межы рэспублікі. Прычым нават у выпадку дамоўленасці аб пастаўках ад нашых прадпрыемстваў патрабуюць узамен дэфіцытную прадукцыю.

Узнікае часам неразбяpыха. Так, што згодна з пагадненнем з Расіяй, мы павінны 40 тысяч тон мяса накіраваць у Санкт-Пецярбург, адкуль, дарэчы, мала чаго атрымліваем узамен. Але калі нашы прадстаўнікі едуць за нафтай у Цюмень, там таксама выстаўляюць патрабаванні аб вялікіх пастаўках мяса, без чаго нафты нам не бачыць. Прыходзіцца аператыўна шукаць кампраміснае выйсце.

Увогуле, назіраецца націск з боку «сыравінных» рэспублік, такіх, як Расія, Азербайджан, Узбекістан, Туркменія, на краіны былога СССР, якія займаюцца выпускам канчатковай прадукцыі. У выніку Беларусь аказваецца ў цяжкім становішчы, бо вытворцы сыравіны ўсё часцей заяўляюць аб намеры гандляваць ёю, асабліва энерганосьбітамі (нафта, газ, вугаль), па сусветных цэнах. У гэтым выпадку Беларусь трапляе ў эканамічную пастку: ёй тады вельмі нявыгадна будзе прадаваць прадукцыю жывёлагадоўлі.

Напрыклад, калі Беларусі гандляваць з нафтаздабываючымі краінамі былога СССР— Расіяй і Азербайджанам, нават, на першы погляд, на льготных умовах — 1:25 (долар роўны 25 рублям), то і тады наша гаспадарка не вытрымае напружання. Тона нафты будзе каштаваць 120 долараў, а кілаграм мяса — долар з некалькімі цэнтамі. У выніку акрамя паставак мяса ў 120—150 тысяч тон нашай рэспубліцы за нафту давядзецца даплачваць 17 мільярдаў рублёў.

Трэба шукаць альтэрнатыўных пастаўшчыкоў паліва, магчыма, на Блізкім Усходзе, каб не апынуцца ў будучым без бензіну, мазуту. Як прагназіруюць спецыялісты, Расія, пры ўмове, што падзенне здабычы нафты не ўдасца спыніць, у 1993 годзе зможа забяспечваць толькі сябе. У горшым выпадку ёй прыйдзецца нават экспартаваць нафту.

Ужо сёння ясна, што вельмі цяжка, калі наогул магчыма, дамовіцца краінам СНД аб агульным эквіваленце ўзаемных паставак. Хутчэй за ўсё прыйдзецца дамаўляцца асобна кожнай дзяржаве з іншай аб такой эквівалентнасці.

Як жа ў гэтай сітуацыі будзе забяспечвацца сельская гаспадарка Беларусі матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі? Ужо ёсць папярэдняя дамоўленасць з расійскім кіраўніцтвам аб істотных пастаўках у рэспубліку, каб працаўнікі вёскі здолелі сёлета правесці сяўбу, сабраць ураджай.

Не менш складаным у бліжэйшай будучыні бачыцца забеспячэнне рэспублікі збожжам. На ўтрыманне сённяшняга статка нам не хапае каля чатырох з палавінай мільёнаў тон збожжа. Самым простым, вядома, было б пайсці на скарачэнне статка, але гэты шлях непрымальны.

Што рабіць? У бліжэйшы час урад мяркуе адпусціць цэны на збожжа. Калгасы і саўгасы ў межах рэспублікі змогуць прадаваць яго па рынкавых цэнах. Бо ўраду больш выгадна заплаціць высокую цану ў рублях, чым набываць збожжа за мяжой за валюту. Аднак, заўважыў В. Кебіч, без павелічэння сёлета збожжавага кліна Рэспубліка Беларусь можа трапіць у цяжкае становішча з прадуктамі харчавання. Надышоў час больш ашчадна выкарыстоўваць землі, большыя плошчы адводзіць не пад травы, а пад збожжавыя культуры.

Парадаксальна, але факт: Беларусь, у якой шмат сучасных прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, сёння вымушана адмаўляцца ад закупкі патрэбнай колькасці бавоўны. Застаецца адно — замяняць яе льном і хімічнымі валокнамі і ніцямі.

Крызіс адбіўся і на забеспячэнні рэспублікі алеем. Безумоўна, трэба самім нарошчваць яго выпуск. Але ж трэць гэтай каштоўнай прадукцыі, якую даводзіцца закупляць за долары, ідзе на тэхнічныя мэты. Без увядзення свабодных цэн на алей з падобнай безгаспадарчасцю не справіцца.

У горкую праблему вырас істотны недахват цукру. Як ні круці, а жыццё прымусіць пераходзіць на прагрэсіўныя тэхналогіі вырошчвання цукровых буракоў, іх перапрацоўку. На адносіны з Кубай надзеі больш няма, а Украіна таксама спыніла нам пастаўкі. Цукар, праўда, можна набыць за долары, але...

Гэтых «але» нямала прагучала ў прамове Старшыні Саўміна. Пераход да рынку выклікаў шмат негатыўных з'яў.

(Заканчэнне на 5-й стар.).

Генадзь Лавіцкі:

«Нас чакаюць не лепшыя часіны»

У эканамічным варварстве (ні больш, ні менш) абвінавацілі народныя дэпутаты Лепельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Страсці разгарэліся спачатку на сесіі гарсавета, а прадоўжыліся на сустрэчы з народным дэпутатам Рэспублікі Беларусь па Лепельскай выбарчай акрузе № 166 Г. Лавіцкім. Зразумела, вакол самага галоўнага пытання — хто накорміць народ? 60 гадоў гэта сяк-так рабілі калгасы. Сёння, атрымаўшы магутны цэнавы і падатковы ўдар пад дых, сяляне ўслых загаварылі аб самым страшным — магчымым голадзе і грамадзянскай вайне.

Ды і як не загаварыць? Нават самая моцная гаспадарка не вытрымае такога эканамічнага прэсінгу, калі цэны на прамысловую прадукцыю вызначаны як свабодныя і ўзраслі ў сярэднім у 10 разоў, а на сельскагаспадарчую — фіксаваныя і падняліся ўсяго ў 3,8 раза. Калі гаспадаркі літаральна рабуюцца мноствам падаткаў. Калі, нарэшце, радавы банкаўскі служачы атрымлівае заработную плату дзве тысячы рублёў у месяц, а даярцы пры ўсім жаданні не могуць заплаціць больш як 800...

Разгон, інакш і не скажаш, калектыўных гаспадарак вельмі нагадвае метады фарсіраванай сталінскай калектывізацыі. А стаўка на гаспадара-фермера, лічаць аграрнікі, пакуль што заўчасная.

— Мы праверылі гэта, — гаворыць старшыня калгаса «Парыжская камуна» М. Баранаў, — як кажуць, з алоўкам у руках. Проста селі і дакладна падлічылі, як рэальна зрабіць нашых калгаснікаў фермерамі. 12 працэнтаў сваіх сем'яў можам забяспечыць тэхнікай. Яшчэ двум працэнтам аддадзім коней. Што рабіць астатнім? У парабкі ісці? Сёння не знайшлося ў калгасе ніводнага жадаючага стаць фермерам.

— Самае страшнае — пазбаўленне перспектывы, — лічыць дырэктар райаграпрамтэхнікі А. Яфімовіч.—Мы, абслугоўваючыя структуры, вымушаны абдзіраць калгасы. Сёння ніводная гаспадарка раёна не мае магчымасці заключыць дагавор з райсельгасхіміяй. Значыць, недаатрымаем угнаенняў, не апрацуем палі. Дык ці можна будзе разлічваць на добры ўраджай? Ніколі! Скажыце, які калгас, тым больш фермер, можа купіць сёння ўстаноўку для ахаладжвання малака больш як за паўмільёна рублёў?

У такой вельмі эмацыянальнай размове ўдзельнічалі не толькі кіраўнікі-аграрнікі, але і ўрачы, рабочыя, гандляры. І выступленняў, і пытанняў было шмат. Ну, а што думае наконт гэтага народны дэпутат, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Г. Лавіцкі, якому і давялося трымаць перад сваімі выбаршчыкамі адказ за палітыку Вярхоўнага Савета?

— Генадзь Міхайлавіч, наш ціхі правінцыяльны гарадок даўно не ведаў такога напалу страсцей. Але ўсіх нас у першую чаргу хвалюе самае галоўнае — куды мы ідзём, што чакае народ Беларусі?

— Вы памятаеце, напэўна, што яшчэ ў снежні мінулага года на сустрэчы з выбаршчыкамі мне давялося выслухаць нямала папрокаў і абвінавачванняў: «Чаму развалўся Саюз, калі народ у ходзе рэферэндуму ясна сказаў сваё слова?», «У сталінскія часы за спазненне на 5 хвілін на работу аддавалі пад суд, а сёння «правіць баль» анархія, ніякай дысцыпліны», «Хто паклапоціцца аб пенсіянерах і ветэранах?» Ужо тады адчувальнай была нарастаючая трывога за дзень сённяшні, за заўтрашні лёс. Шэсць гадоў назад людзі паверылі ў перабудову. І вельмі не хацелася б, каб адчулі яны сябе падманутымі.

Наш шлях далёка не прамы і не ясны. Спачатку мы ішлі да сацыялізму «з чалавечым абліччам», потым — да «рэгулюемага рынку», цяпер, скажам прама, — да капіталізму. Аб'яўляем новы этап — пераходны перыяд. Успрыняты ён без захаплення. У былым Савецкім Саюзе яўна адбываецца расслаенне грамадства. Згодна з данымі сацыёлагаў, сёння 0,5 працэнта насельніцтва сталі мільянерамі, а 85 працэнтаў апынуліся за рысай беднасці. І ўжо рэальна відаць, што ў былых кіраўнікоў ніякай канцэпцыі перабудовы не было. Была гучная фраза, палітычны лозунг. Шэсць пражытых гадоў можна параўнаць з боем, пачатым без разведкі, дэталёвай ацэнкі абстаноўкі, вызначэння канкрэтных мэт і задач, тэрмінаў іх дасягнення. У многім маюць рацыю выбаршчыкі: палітычныя догмы і барацьба за ўладу працягваюць душыць эканоміку.

— Мне даволі часта даводзіцца гутарыць з рабочымі, калгаснікамі. І, паверце, людзі заблыталіся: за кім праўда — за тымі, хто поўнасцю стаіць на сацыялістычных пазіцыях, ці іх апанентамі?

— Ухваляць або ганьбаваць рэвалюцыю кастрычніка 1917 года — справа бяссэнсавая. Гэта старонка не толькі нашай, але і сусветнай гісторыі. Так што ўспрымаць яе трэба такой, якой яна была. Аб'явіўшы той кастрычнік памылкай, мы, на жаль, не адмовіліся ад рэвалюцыйнай метадалогіі, рэвалюцыйных лозунгаў і дзеянняў. Заявіўшы ў красавіку 1985 года: «Рэвалюцыя працягваецца», сёння мы апынуліся на «мерыдыяне» кастрычніка 1917 года. За шэсць гадоў паспяхова ажыццявілі толькі адзін лозунг з рэвалюцыйнага гімна. Па-рэвалюцыйнаму хутка, не азіраючыся на мінулае, разбурылі ўсё, што мае хоць нейкія адносіны да сацыялістычнай ідэі, да пражытых 74 гадоў.

Сёння не ўзнікае пытання патрэбнасці радыкальных змен, рэфармавання нашай дагматычнай сістэмы. Пытанне заключаецца ў практыцы ажыццяўлення рэформ. А яна, на жаль, да болю знаёмая. У 17-м бальшавікі пачалі з падаўлення палітычных апанентаў. Сёння, асудзіўшы бальшавізм, саслізнулі на шлях палявання на палітычных праціўнікаў, іх публічнага шальмавання. Зноў мы ішлі на «штурм палаца» — варварскае знішчэнне помнікаў. [illegible]

Гэтак жа па-рэвалюцыйнаму рашуча абыходзімся з законамі і заканадаўствам. Канстытуцыя адрынута. Саюзны дагавор кануў у небыццё. [illegible]

Жорстка ўдарыла рэвалюцыйная [illegible] па эканоміцы. [illegible] адзіны гаспадарчы механізм. [illegible]

Так, нам патрэбны рэвалюцыйныя пераўтварэнні ва ўсіх сферах. Але па сутнасці, а не па форме.

Я за тую палітыку [illegible]

— Магчыма, не такія ўжо далёкія ад ісціны тыя, хто патрабуе адстаўкі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і ўрада?

— Я поўнасцю згадзіўся б з гэтым, каб рэальна бачыў, хто прыйдзе ўзамен. Няма ніякай гарантыі, што новыя парламент і ўрад не аб'явяць рэжым жорсткага таталітарызму. Або, наадварот, надыдзе поўная анархія.

Будучае Беларусі залежыць ад таго, ці змогуць яе палітыкі, урад [illegible] над уласнымі амбіцыямі, [illegible] з мінімальнымі затратамі і нязначнымі сацыяльнымі хваляваннямі.

На мой погляд, варта пераходзіць на выпуск [illegible]

— А сельскай гаспадарцы [illegible]

— Самае галоўнае — стабілізаваць палітычную абстаноўку, [illegible]

Далей, перагледзець структуру органаў улады і кіравання, [illegible] мінімальна затратнымі і максімальна эфектыўнымі.

Не магу не сказаць аб такім важным пытанні, [illegible] займаюцца пасрэдніцкай дзейнасцю замест вытворчасці канкурэнтаздольнай прадукцыі і тавараў. Адсутнасць дакладнага закона аб дзяржаўнай службе прыводзіць да таго, што паўсюдна назіраецца сумяшчэнне дзяржаўнай службы з прадпрымальніцкай дзейнасцю.

— А як вы ставіцеся да прагучаўшай прапановы наконт [illegible] друку, [illegible] і за [illegible] ужо [illegible] гэта [illegible] на ве-[illegible]

— Як супрацоўнік КДБ скажу: [illegible] не па-[illegible] правя-[illegible] дзяржавы. [illegible] гэта пытанне ў Вярхоўным Савеце [illegible] водзіць [illegible] даходах [illegible]. А ў цывілізаваных краінах Захаду — гэта норма.

— Генадзь Міхайлавіч, у Лепелі падрыхтаваны цэлы пакет патрабаванняў да Вярхоўнага Савета. Напрыклад, увесці індэксацыю цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю; [illegible] прадпрыемстваў [illegible] абслугоўваючых [illegible] усе [illegible] парламентам?

— [illegible] мне [illegible]. Нельга [illegible] 20-х гадоў, [illegible] усе [illegible]. Гэта [illegible] хоць [illegible] людзей, калісьці [illegible] Вярхоўным Савеце.

— І апошняе пытанне: што чакае нас у бліжэйшым будучыні?

— Рэспубліку, як жыхароў, напэўна, чакаюць нялёгкія часіны. Аднак вялікі патэнцыял Беларусі, рацыянальнае і правільнае яго выкарыстанне, прагназіраванне падзей і своечасовая падрыхтоўка да іх дапамогуць пазбегнуць вялікіх сацыяльных хваляванняў.

Гутарыла А. ЦЯЛЯТКА.

КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ

Рубрыку вядзе Аляксандр БУРДА, брокер фірмы «Аліна»

Даходнасць, надзейнасць, ліквіднасць

Цяпер усім зразумела — толькі гаспадар зможа наладзіць эфектыўную вытворчасць. Прыватны прадпрымальнік, уласнік, карацей — гаспадар не можа дапусціць страт, інакш яго чакае разарэнне. Таму, каб выбрацца з крызісу, трэба перадаць дзяржаўную ўласнасць у прыватныя рукі, правесці прыватызацыю. Але як гэта зрабіць? Канешне, дробныя прадпрыемствы гандлю і службы быту (магазіны, цырульні, хімчысткі і г. д.) можна прадаць асобным грамадзянам або самім жа працоўным калектывам. Але як прадаць буйныя заводы? Яны ж каштуюць шмат мільёнаў, і ў работнікаў не знойдзецца такіх грошай. Вядома, работнікі, калі яны сапраўды хочуць прыватызавацца, могуць узяць грошы ў крэдыт. Але крэдыт надоўга не возьмеш, ды і працэнты вялікія. А грошы патрэбны не толькі для выкупу, але, і ў першую чаргу, для развіцця вытворчасці. Што ж рабіць?

А што калі прапанаваць усім жадаючым стаць саўладальнікамі прадпрыемства, укласці ў яго асабістыя зберажэнні? Гэта выгадна ўсім: прадпрыемства атрымлівае грошы на працяглы тэрмін (часцей за ўсё — бестэрмінова), за гэты кошт напрацоўвае прыбытак. Частку гэтага прыбытку атрымліваюць укладальнікі грошай (акцыянеры) ў выглядзе дывідэндаў. Прычым размер дывідэндаў вызначаюць самі акцыянеры на агульным сходзе: якую частку прыбытку накіраваць на развіццё вытворчасці, а якую — падзяліць прапарцыянальна ўкладу кожнага. Акцыянеры ж — гаспадары прадпрыемства (дакладней, ужо не проста прадпрыемства, а акцыянернага таварыства), яны ўклалі ў яго свае кроўныя (купіўшы акцыі) і па праву патрабуюць адпаведнай аддачы.

Але як вызначыць, куды ўкласці грошы, або, інакш кажучы, якія акцыі купіць? Лепш за ўсё звярнуцца да спецыялістаў рынку акцый і іншых каштоўных папер — у прыватнасці, да брокераў, якія працуюць на Беларускай фондавай біржы. Але можна паспрабаваць вызначыцца і самому. Перш за ўсё трэба засвоіць свае мэты: вы хочаце проста зберагчы свае грошы ад інфляцыі або гатовыя пайсці на рызыку дзеля максімальнай выгады? Укладваеце грошы надоўга, ці яны могуць спатрэбіцца вам у любы момант? Інакш кажучы, вы павінны ацаніць галоўныя якасці любых акцый (і не толькі акцый, а наогул каштоўных папер):

— даходнасць,
— надзейнасць,
— ліквіднасць.

Разбяромся ў гэтых якасцях паасобна.

Даходнасць. Трэба даведацца, якія дывідэнды выплаціла або плануе выплаціць акцыянернае таварыства? Як змяняецца кошт (курс) акцый на біржы і па-за ёй? Які плануецца прыбытак і ці вялікія падаткі?

Надзейнасць. Хто гарантуе выплату дывідэндаў? Ці надзейныя найбольш буйныя акцыянеры? Ці можна чакаць павелічэння курсу акцый?

Ліквіднасць. Наколькі актыўна купляюцца і прадаюцца каштоўныя паперы? Ці можна прадаць іх выгадна і хутка?

Толькі адказаўшы на гэтыя і іншыя пытанні, можна прыняць правільнае рашэнне. Вядома, вы павінны хоць неяк рабірацца ў рынку каштоўных папер. Для таго каб дапамагчы вам, мы і адкрылі гэту рубрыку.

У бліжэйшых нумарах газеты будзе расказана аб відах каштоўных папер. І пачнём з асноўнага віду — акцый.

Сачыце за новай рубрыкай!

***

НАГАДВАЕМ: рубрыку вядзе Аляксандр БУРДА, брокер фірмы «АЛІНА». Тэл. 64-16-30.

Спакуса свабоды

З нагоды выстаўкі «Графіка-91»


Кожная размова аб мастацтве — справа цяжкая, няўдзячная. Якім бы высокім ні быў яе ўзровень, заўсёды застаецца нейкая неадольная мяжа, якая падзяляе саму размову—словы, паняцці, вызначэнні і яе тэму—мастацкі твор. Ён валодае сваёй уласнай сутнасцю, і тая—няхай самай малой сваёй часткаю—ды ўсё ж непадуладная словам. Авалодаць гэтай сутнасцю здольна толькі таксама невымоўная істота нашае душы. Яна, не карыстаючыся словамі, прымушае нас вызначаць добрае як добрае і благое як благое. Але, каб пераканацца ў праўдзівасці нашага выбару, усвядоміць, чаму мы лічым так, а не іначай, і трэба весці размову, падмацоўваць пачуцці розумам, у сумленным разважанні называць рэчы іх імёнамі.

ВЫСТАЎКА «ГРАФІКА-91»—з'ява ў нашай культуры невыпадковая і паказальная. Адметная яна не надзвычай моцнымі творамі. Такія працы там знайсці цяжка. Гэта—выстаўка паўсядзённасці, выстаўка на тэму «вось што мы зараз робім». Менавіта тым яна і паказальная. Таму, разглядаючы прапанаваныя нам творы, можна меркаваць аб схільнасці беларускага мастацтва да таго ці іншага шляху развіцця. Можна ўявіць стаўленне мастакоў да мэты і сэнсу творчасці ва ўмовах неабмежаванай волі. Гэта выстаўка пазбаўлена якога-небудзь дэвізу, у яе няма загадзя вызначанай «праграмы». Але яна відавочна мае рысы гуртовага аднадумства, нават —калі можна так сказаць—«эстэтычнага калектывізму».

У чым жа адзінства мыслення аўтара, калі творы знешне гэтак розняцца між сабою—ад беларускага сюррэалізму Г. Скрыпнічэнкі да спробы інсталяцыі і нейкага пост-поп-арта К. Вашчанкі? Што яднае эстэцкі тэхналагізм Г. Гладкевіча і наўмысна бездапаможныя гравюры Д. Локіця і У. Правідохіна? І ці можна аднесці да такога віду мастацтва, як графіка, гіпсавы рэльеф лятаючага шкілета, выкананы У. Вішнеўскім, ужо не кажучы пра вышэйпамянёны «аб'ект» з сінтэтычных вяровак, створаны К. Вашчанкам? Нягледзячы на тое, што гэтыя пытанні відавочна не існуюць для аўтараў, адказ на іх усё-такі ёсць.

Каб вызначыць, у чым жа тое агульнае, што яднае гэтых мастакоў, перш за ўсё неабходна адказаць на пытанне: ці кожная выява з'яўляецца выяўленчым мастацтвам? Чаму яно падуладна: сваім аб'ектыўным законам, ці толькі суб'ектыўнаму крытэрыю—самавыяўленню аўтара?

Мастацтва класічнае, традыцыйнае—неадлучная частка культуры. І яно зусім не вольнае ад сутнасных яе законаў, якія, у сваю чаргу, адпавядаюць асновам чалавечага быцця. Мастацтва страга іерархічнае і тым самым прад'яўляе да мастака пэўную сістэму патрабаванняў, умоў, у якіх ён павінен выявіць самога сябе і свае жаданні. Традыцыя—гэта не адмерлая мінуўшчына, не «адзін з магчымых шляхоў развіцця мастацтва», але яна сасная яго азнака, неабходная ўмова яднання мастака з усім ходам быцця.



В. Баранаў. Змярканне.

Мастацтва ўвогуле абумоўлена быццём і ўсёй сваёй сутнасцю выяўляе глыбінныя яго мэты. І наколькі канкрэтнае само жыццё, з яго непадуладнымі нам формамі, так і мастацтва не здольнае адрынуць дадзеную яму рэчаіснасць, не страціўшы сваю сутнасць. Калі ведаць, што культура перш за ўсё—традыцыя, «захаванне часу», то відавочна, што ўсе формы мастацтва, шануемыя як класічныя ўзоры, маюць сваёй падставаю, сваім вытокам зварот да быцця. І бязмежнае багацце стыляў, пластычных вынаходстваў, форм—дзеля аднаго: адшукаць вобраз быцця. Дасягаючы свайго вянца, творчасць вяртаецца да свайго вытоку. Мастацтва свабодна аддае сябе ва ўладу Богу, Сусвету і чалавеку, каб дасягнуць найвышэйшага свайго ідэалу—«трыадзінства ісціны, дабра і прыгажосці», паводле слоў Уладзіміра Салаўёва. Гэты ідэал яшчэ нікому не ўдалося адмяніць.

АЛЕ Ж ЁСЦЬ І ІНШЫ ПОГЛЯД. Спакуса той свабоды, што дадзена чалавеку, ляжыць у яго аснове. Спакуса свядома ці неўсвядомлена ўзнесці сябе вышэй Бога і Сусвету, вышэй мастацтва дзеля бязмежнай творчай волі ці творчага самавольства. Адмаўленне законаў мастацтва, а роўна і законаў быцця, ігнараванне ідэалу і сэнсу творчасці. Гэта асобны светапогляд, і ён мае як сваіх тэарэтыкаў, так і практыкаў, мастакоў, якія мэтанакіравана ўвасобілі прынцыпы творчага самавольства. Сапраўдная спакуса для мастака—быць нічым не абмежаваным, непадначаленым нічаму, апрача сваіх жаданняў. Калі глядзець на быццё як на выпадковае, без мэты, без ідэалу існаванне — то ў такім разе не толькі магчымыя, але і поўнасцю апраўданыя любое дзеянне, любы ўчынак. Кожная «акцыя», кожная рэч, кожная выява можа і павінна лічыцца мастацтвам, паколькі мастак гэтак абвяшчае. Традыцыйныя формы мастацтва, абумоўленыя гісторыяй і этнічнай непаўторнасцю культур, выцясняюцца з жыцця, падмяняюцца знешне шматаблічным, але па сутнасці пазакультурным і пазанацыянальным самавыяўленнем духоўна раз'яднаных людзей.

Калі ў мастацтве пачынае панаваць такі стан, у свядомасці і падсвядомасці людзей знікае класічны, спрадвечны погляд на культуру, першапачатковы «інтарэс да новага» пераўтвараецца ў «культурнае спажывецтва», неразуменне, адцуранне ад сутнасці існавання мастацтва ў жыцці. Рускае слова «потребление» вельмі добра вызначае сэнс гэтай з'явы, бо на старарускай мове «потреблять» —гэта «знішчаць».

Культура ўсяго свету зведвае падобную загану, у поўным сэнсе «хваробу духу». Гэта мутацыя культуры—таксама «духоўнасць», але адваротнага напрамку. Малаверагодна, што выстаўка «Графіка-91»—гэта мэтанакіраваны маніфест свядомых прыхільнікаў «мастацтва нумар два». Ні аб якім асэнсаваным увасабленні іншакультурных ідэалаў і канцэпцый тут гаварыць няварта. Гэта бяздумнае жаданне авалодаць усім «новым», далучыцца да яго, убачыць самога сябе «наперадзе прагрэсу». Неразвітая свядомасць, нявыхаваны густ хутка пераўтвараюцца ва ўсёеднасць, і мастак становіцца рабом уласных жаданняў. У гэтым—найбольшая, найвялікшая «заслуга» выстаўкі: яна паказвае нам, як светапогляд і творчасць мастака змяняюцца незалежна ад яго розуму і волі. Як знешняе патуранне вядзе да ўнутранай змены. Ідэя, узятая як падстава для спробы працаваць іначай, паступова падначальвае мастака, пазбаўляе творчай волі і кіруе ім.

Пра гэта сведчаць невыпадковыя супадзенні ў розных працах, «паралелізм мыслення» творча далёкіх мастакоў. І, калі ў мастака ёсць свабода так ці інакш выяўляць сябе, павінна быць і свабода разважаць аб гэтых «выяўленнях» з нейкіх грунтоўных пазіцый.


ШТО ТУТ МЫ ЗАЎВАЖАЕМ? Адметная рыса мноства прац—зварот да дэталі, знешняя закончанасць. Калі дэталь не мае сутнаснай сувязі са зместам працы, яна набывае іншае, «злаякаснае» значэнне і ўжо не вызначае задуму і сэнс, але знішчае іх, пазбаўляе працу гарманічнага адзінства. Мастак нібы заяўляе аб тым, што яго мысленне прайшло ўвесь шлях ад Леанарда да Вінчы да «Чорнага квадрата» Малевіча і стаіць вышэй «бязглуздага рэалізму», бо мае здольнасць вяртацца да зыходнага пункту. І не мае значэння, што мастак «тачыў»—ці то галаву, ці то часткі абсурдных машын, плывучыя ў нябёсах жаночыя грудзі або абстрактную фактуру ў левым ніжнім кутку. Дэталь павольна плыве ў выяўленчай прасторы, трапляючы па самавольству аўтара ў любое месца аркуша. За гэтаю «зробленасцю» аўтар хавае—у тым ліку і ад самога сябе—нясталасць свайго мыслення, хавае сутнасную пустату працы, якая дзякуючы дэталі набывае знешнюю і падманную закончанасць, добры «таварны выгляд». Прыклады таму—і творы Г. Скрыпнічэнкі, і як новыя, так і ранейшыя творы М. Селешчука, у тым ліку яго «Пачуцці віны за абгрунтаванасць», і працы У. Вішнеўскага, і жахлівыя па колеру і сэнсу пано У. Пчалінцава.

Але ж У. Савіч, які раней добрасумленна «тачыў» свае творы, зараз ад дэталёвасці адмовіўся. Аднак прынцыпова гэта мала што мяняе. Калі ў аркушы пад назваю «Пошук веры» падобная на анёла постаць раптам набудзе чалавечы твар ці рукі—ні «пошуку», ні «веры» ў творы не прыбудзе. Такім чынам, у гэтай творчай методзе і выкананне дэталі, і адмова ад яе—раўназначныя. Сэнс паспяхова ліквідуецца на кожным з гэтых шляхоў. Дакладней, яго падмяняе процісэнс, шыфр, тайнапіс, які зразумелы аднаму толькі мастаку і дазваляе меркаваць аб яго «інтэлектуальнасці і таямніцах творчай душы».

Мноству прац уласціва захапленне аўтара выпадковаю фактурай, знешнім эфектам. Фактура, самавольна ўзнікшая альбо мэтанакіравана зробленая, складае галоўны сэнс гэткіх твораў. «Тэхналагізм» такога ўзору дэманструюць зноў жа працы У. Савіча—«Прынесці раўнавагу ў іх душы», «На скрыжаванні дарог», «Свет, заключаны ў маўчанні». На гэтым прынцыпе пабудаваны і працы В. Баранава. Але ж калі В. Баранаў дамагаецца дасягнуць нейкага пластычнага строю, візуальнай гармоніі альбо кантрасту ў аркушы, то І. Кашкурэвіч ужо вызваліў сябе ад розных мастацкіх забабонаў. Яго творы з нізкі «Бестыярый» яўна антытэхналагічныя. Звышзадача работы — паказаць паталагічнасць хімерычных пачвар, і ёй поўнасцю адпавядае прынцыповая адмова ад пластычнай культуры. Калі працы, напрыклад, М. Селешчука ці братоў Басалыгаў сведчаць аб самапаўторы, аб сапсаваным гусце мастакоў, то І. Кашкурэвіч прынцыпова і паслядоўна рэалізуе процігуст, законанепрымальнае патрабаванне «творчай свабоды». Чым больш у працы абразы, тым больш яна спрыяе дасягненню канчатковай мэты: выклікаць агіду ў гледача, навязаўшы яму сваё стаўленне да жыцця.

«Свабода творчасці», якая не мае апірышча ў традыцыйнай культуры, паслядоўна вядзе да ўзнікнення ў творах відавочнай паталогіі. Гэтая плынь, што прэтэндуе на панаванне ў сучасным мастацтве, моцна адбілася на працах маладога мастака У. Дамнянкова. Яго аркушы з нізкі «Марфагенез» —«Працуючая мадэль шматпавярховага храма», «Конны выезд на сакалінае паляванне абразца (так! —А. С.) 31-га года» і «Ні пуху, ні пёрка»—нейкім чынам сапраўды «абразец». Гэта амаль што маніфест, падобны на словы мастака А. Вярэніча, абвешчаныя часопісам «Крыніца» ўсяму свету: «Розум! Вышэй за яго стаіць толькі абсурд. Здаровы сэнс абмежаваны самім сабою. Абсурд—бясконцы, бо візуальна паказвае тайну». У. Дамнянкоў разумее «візуальны паказ тайны» як спалучэнне заведама несумяшчальных рэчаў. Як збор паталагічна злучаных са шкілетамі і сухажыллямі механізмаў, знікаючых у цемры каленчатых трубак. Гэта нудная справа—самаашуканства ўласнаю «інтэлектуальнасцю», прэтэнзіямі на «філасофскае абагульненне» і «еўрапейскі ўзровень».

Зразумела, «вольны мастак» не можа ўхіліцца ад увасаблення рэчаў сапраўды сур'ёзных—тых, што спрадвеку лічыліся святымі. І калі не задавальняе яго здаровы сэнс—застаецца яму «нездаровы». І імкнецца ён увесці ў кола гэткай свядомасці паняцці рэлігійныя—тым больш, што яны сапраўды сур'ёзныя і зараз, апрача таго, «дазволеныя». Недасведчанасць у гэтых пытаннях можа лёгка ператварыцца ў сапраўднае кашчунства і дзяшовы дэманізм, тым не менш застаючыся ў вачах аўтара доказам яго «сур'ёзнасці» і нават «духоўнасці». Чалавек, знаёмы з асновамі хрысціянства, ведае, што д' яблы здольныя з'яўляцца не толькі ў вобліку анёлаў, але і пад выглядам самога Хрыста. Ганарлівы чалавек няздольны пазнаць іх і трапляе пад іх уладу. З такога пункту гледжання працы У. Вішнеўскага «Укрыжаваны лёт», «Трохрыбнае ўспрыманне Сусвету», «Арханген Міхаіл», «Чорны і белы анёлы»—не проста «слабыя». Спроба спалучыць відушчае Боскае вока з «Пагоняй» — двайное кашчунства, парушэнне дадзенага Богам ходу быцця. Прысваенне Бога—па сутнасці, абраза Боскага пачатку, блюзнерства. Марнае ўпамінанне Бога вядзе да спрадвечнага Яго ворага—як іначай гаварыць пра намаляваных У. Вішнеўскім д'яблаў, кім яшчэ лічыць лятаючы побач з крыжам шкілет? Вось прыклад таго, што «свабода» ў рэчах сапраўды сур'ёзных вядзе да падначаленасці злу.



К. Вашчанка. Ідэя фікс.

Як можна было ўжо заўважыць, адметная рыса выстаўкі—назвы твораў. Дапаўняючы нястачу вобразнай і пластычнай вартасці, аўтары аддаюцца акту «найменавання» з поўным самазабыццём. Не паўтараючы вядомых ужо чытачу назваў, прыгадаю «Ідэю фікс» К. Вашчанкі. Гэты твор—несумненна новае слова ў сучаснай графіцы. К. Вашчанка неарыгінальны ў сваёй спробе стварыць «аб'ект» з негабляваных рам і сінтэтычных вяровак. Такое ўжо было, і гэта сумна. А вось аднесці гэта да графікі—сапраўды смела, свежа. У гэтым сэнсе «акцыя» несумненна ўдалася, з чым і павіншуем мастацкага рэдактара часопіса «Крыніца». К. Вашчанка вызначае наступны крок беларускага мастацтва на акрэсленым намі шляху. Далей—поўнае знішчэнне выяўленчага мастацтва як сутнасці. Яно не мае сэнсу. Каштоўна тое, што мастак падміргвае нам са свайго кутка.

Працы, пададзеныя на гэтай выстаўцы, — плён асаблівага стану мастацкай свядомасці, і развіццё культуры ў гэтым напрамку не можа не выклікаць трывогі. Вядома, «найлепшыя», «сусветныя» ўзоры такога тыпу творчасці нашымі мастакамі яшчэ не пераўзыдзены. Погляд на такія працы «бацькоў» авангарду супадае з поглядам уладальнікаў камерцыйных галерэй. І адны, і другія лічаць іх таварам, «рэпрадукцыяй ручной работы». Але ж мастак сапраўды свабодны ў сваёй творчасці, і што рабіць—справа яго сумлення. Шкада толькі, што менавіта тыя мастакі, якія некалькі гадоў назад абвясцілі сябе адраджальнікамі беларускага мастацтва, ідуць гэткім шляхам. Шкада, што жаданая «беларускасць» ператварылася ў агульныя месцы авангарду, мастацтва ў поўным сэнсе спажывецкага. І гэта не выпадкова: адчужанасць ад грунтоўнай культуры, неразуменне сэнсу традыцыі вядзе да спробы вывучыць «эсперанта» мастацтва, пайсці лёгкім шляхам. Такі погляд аднолькава чужы кожнай культуры—беларускай, рускай, нямецкай — і найперш моцна шкодзіць сапраўды нацыянальнаму ў мастацтве.

У асаблівым становішчы апынуліся на выстаўцы працы А. Кашкурэвіча, А. Паслядовіч, Л. Асецкага. Высокі стылістычны лад, сапраўдная свабода, густ адасабляюць іх, нібыта хаваюць ад вока гледача. Так спакойная, сур'ёзная размова глухне сярод самазадаволенага шуму, вынішчаецца самім фактам суседства з духоўна несумяшчальнымі з'явамі.

ГРАМАДСТВА, якое не прызнае культурную традыцыю, няздольнае зразумець само сябе. Яно не разумее сэнсу свайго існавання, яго мэты—бо толькі культура нясе веды аб тым. І мастацтва не ў апошнюю чаргу ўдзельнічае ў выхаванні свядомасці, далучае людзей да спрадвечнага руху культуры. Аднаўленне традыцыі ў выяўленчым мастацтве пачынаецца з аднаўлення мастацкай школы, сістэмы акадэмічнага выхавання. Але ж гэта цяжкая справа, асабліва калі ўлічыць, што большасць нашых аўтараў альбо вучыліся ў БДТМІ (зараз БАМ), альбо і дагэтуль выкладаюць у адзінай у краіне вышэйшай мастацкай навучальнай установе.

Андрэй САВІЦКІ.

БІЗНЕС КЛУБ

Абаронім прадпрымальніка

У ліку першых кінулася, так сказаць, у вір прадпрымальніцкай дзейнасці моладзь. І гэта не выпадкова. Многія юнакі і дзяўчаты ўжо мелі пэўны вопыт такой работы ў цэнтрах навукова-тэхнічнай творчасці. Ужо тады імі штогод выконвалася работ на 42—45 мільёнаў рублёў. Таму і ў новай сферы дзейнасці іх справы неўзабаве пайшлі на лад. Менавіта моладзь пачала і ў вялікай меры ажыццявіла тое, што мы сёння называем недзяржаўным сектарам эканомікі.

Аднак узніклі пэўныя праблемы па сацыяльнай абароненасці працуючых. У галіновых прафсаюзах, дзе маладыя прадпрымальнікі стаялі на ўліку, часта не разумелі іх праблем, а іншы раз наогул не імкнуліся дапамагчы. Гэта выклікала заклапочанасць і абурэнне людзей, бо адлічэнні прафсаюзных і іншых узносаў былі ад гэтых прадпрыемстваў істотныя. І ў час сустрэч, абмену вопытам узнікла думка аб стварэнні свайго прафсаюза. На ўстаноўчай канферэнцыі ў снежні 1990 года і быў заснаваны прафсаюз работнікаў інавацыйных і малых прадпрыемстваў Беларусі.

Мінулы год паказаў, што напрамак выбраны правільны. Адразу істотна папоўніліся нашы рады, многія калектывы атрымалі рэальную, не на словах, дапамогу. У прыватнасці, шмат пытанняў узнікае пры стварэнні малых прадпрыемстваў, прымяненні ў іх працоўнага заканадаўства. Кіраўнікі гэтых калектываў даволі часта карыстаюцца кантрактнай сістэмай афармлення працоўных адносін. На жаль, гэту сістэму яны разумеюць як сістэму абавязкаў наёмнага работніка з міласці рабатадаўца. Асабліва пры прыёме і звальненні. Іншы раз звальняюць за выдаванне камерцыйнай тайны, хоць такая ўмова не агаворана ў статуце прадпрыемства ці пры прыёме на работу. Калі падобныя выпадкі становяцца вядомыя нам, мы папраўляем адміністрацыю прадпрыемства. Многа пытанняў узнікае пры змяненні формы ўласнасці, падзеле маёмасці, адносна дывідэндаў членаў працоўнага калектыву. Людзі зноў прыходзяць да нас, і сітуацыя істотна мяняецца.

У апошні час часцей сталі ўзнікаць праблемы скарачэння штатаў, выкліканым падзеннем аб'ёмаў вытворчасці, жорсткім падатковым заканадаўствам. І тут прафсаюз імкнецца не заставацца ўбаку. [illegible] пасрэдніцтва ў працоўных калектывах, [illegible] растлумачальную работу, вучобу. Калі ж чалавек вымушана страчвае працу, імкнёмся аказаць [illegible] дапамогу. На гэтыя мэты накіроўваем сродкі [illegible] ад прадпрыемстваў [illegible] ці. Дарэчы, у нашым прафсаюзе 80 працэнтаў [illegible] саў застаецца ў першасных арганізацыях [illegible] некаторых [illegible] ве за кошт [illegible] прадпрыемстваў [illegible] кай дзейнасці [illegible] істотна [illegible] няў на [illegible] прафсаюза [illegible] мацыйна-камерцыйнае прадпрыемства [illegible] аўдытарскай і турысцкай фірмаў. [illegible] які [illegible] вічныя [illegible].

Сфера дзейнасці прафсаюза распаўсюджваецца на ўсю рэспубліку. [illegible] пад імя [illegible] цуючыя [illegible] ры эканомікі [illegible] кожны [illegible] на ў Мінску [illegible] стытут [illegible] у абласных цэнтрах [illegible] туды [illegible] вых арганізацый [illegible] цыялісты [illegible] спрэчных пытанняў [illegible] на месцы.

Як і ўсіх, хто працуе на малых прадпрыемствах, у арганізацыях недзяржаўнага сектара эканомікі [illegible] на турбуе [illegible] ня праблемы [illegible] сказаць [illegible] нак. На жаль [illegible] творцамі [illegible] мення [illegible] кі зробяць [illegible] вар, нават [illegible] ба дапамагчы [illegible] дукцыі [illegible] дзе вырабляць [illegible] слугі — [illegible] прадпрыемства [illegible] лым.

Ю. ГОЛУБ,
старшыня Цэнтральнага камітэта прафсаюза інавацыйных і малых прадпрыемстваў.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

У рэспубліцы створаны Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў. Аб перспектыўных напрамках яго дзейнасці, праблемах малога бізнесу расказвае старшыня праўлення фонду М. БАБРЫЦКІ.

Фонды розныя патрэбны

— Мікалай Рыгоравіч, фонд падтрымкі створаны ўрадам. І таму ёсць думка, што ён аказваецца яшчэ адной бюракратычнай арганізацыяй, здольнай не дапамагаць, а толькі размяркоўваць.

— Увогуле, у самым пачатку [illegible]

[illegible]

ідэя цікавая, але адсутнічае поўная гарантыя яе ажыццяўлення.

— Хто рэальна будзе займацца такімі распрацоўкамі, ці пойдуць на вас сапраўды ініцыятыўныя дзелавыя людзі?

[illegible]

тут таксама плануем ладзіць [illegible] асновe.

— Якія сродкі мае фонд і як іх выкарыстаць?

[illegible]

— Як, на ваш погляд, ідзе развіццё альтэрнатыўных структур у эканоміцы рэспублікі?

[illegible]

...не адваротнага ўплыву. Бо чакаць, пакуль адміністратары прачнуцца і стануць дапамагаць нам, бесперспектыўна.

— Чаму так атрымліваецца?

— Каб змяніць сітуацыю ў лепшы бок, ва ўрадзе павінна быць структура, якая б займалася дзяржаўнай падтрымкай прадпрымальніцтва. Трэба, каб урад, Вярхоўны Савет, іншыя кіруючыя работнікі заявілі: прадпрымальніцтва — гэта неад'емная частка дзяржаўнай эканамічнай палітыкі рэспублікі.

Між тым, варта было б узяць на ўзбраенне і міжнародны вопыт. У Італіі, напрыклад, усе— ад прэзідэнта да мэра горада займаюцца стварэннем сістэмы дзяржаўнай падтрымкі прадпрымальніка. Гэта можа быць тое ж пераразмеркаванне неэфектыўна выкарыстоўваемых плошчаў дзяржаўных прадпрыемстваў. У рэальнасці назіраецца адваротнае. У час канверсіі не задзейнічаны вялізныя карпусы на заводах ваенна-прамысловага комплексу, а прадпрымальнікі тым часам сяляцца ў падвалах, іншых непрыстасаваных памяшканнях. Калі знайшлі адлюстравання многія важныя моманты ў дзейнасці цяперашніх бізнесменаў.

Адназначна негатыўна ўспрынялі эканамісты і кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў апошняе падатковае заканадаўства, якое неабходна мяняць неадкладна. Вядома, сёння ні насельніцтва, ні чыноўніка, які вырас у рамках партапарату, не прымусіш палюбіць прадпрымальніка. Але нават сусветны вопыт падказвае, што сёння варта пачынаць падтрымліваць нават так званае «дзікае» прадпрымальніцтва, каб на яго аснове як мага хутчэй развіваўся цывілізаваны бізнес. І выйсце бачыцца ў тым, каб кожны, хто пажадае, мог займацца прадпрымальніцтвам: на зямлі, у гандлі, на вытворчасці. А гэта магчыма, калі такія падыходы стануць дзяржаўнай палітыкай і будзе ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

— Значыць, вы верыце ў перспектыву наладжвання стабільных узаемаадносін прадпрымальнікаў з урадам?

— Безумоўна. Кантакты будуць развівацца. Таму што ўрад зацікаўлены ў гэтым не менш, чым мы самі. [illegible] трэць работнікаў, там стварылі саюз беспрацоўных. І вось гэтыя людзі прапанавалі, каб трэць вытворчых плошчаў была перададзена ім у арэнду. Там палічылі, што калі кіраўніцтва прадпрыемства не здольна арганізаваць работу належным чынам, саюз беспрацоўных здолее заняць скарочаных. Не мае значэння, якая там будзе вытворчасць, важна, што беспрацоўныя самі абяцаюць наладзіць работу, забяспечыць кожнага прыстойнай зарплатай. Цяпер людзі звярнуліся ў Саюз прадпрымальнікаў і мы вывучаем сітуацыю. Калі б урад падтрымаў першыя парасткі новай ідэі, рабочыя менш хадзілі б на мітынгі, а браліся б за справу. А мы ў сваім фондзе знайшлі б і сродкі, і здольных людзей, якія арганізавалі б вытворчасць. Такія падыходы значна зменшылі б сацыяльнае напружанне ў грамадстве, скіравалі ўвагу рабочых не на ўтрыманства, а на пошук выйсця з крызісу. І чым больш будзе ініцыятыўных людзей, тым лепш. Наш фонд са свайго боку будзе займацца іх пошукам, не толькі маральна, але і матэрыяльна заахвочваць самыя перспектыўныя прапановы.

Інтэрв'ю вёў Мікалай БАЖКО.

...цае значна большыя набыткі, чым страты. І ў першую чаргу стварае ўстойлівую базу для атрымання ў будучым тых жа падаткаў у бюджэт.

Выдзеленыя грошы мы бу- [illegible]

Галерэі ад «Глорыі»

Падзея для нашых дзён рэдкая: тыя, хто прафесіянальна «робяць» грошы, добраахвотна ўклалі частку свайго прыбытку ў справу з нулявой рэнтабельнасцю.

— І не шкадуем,— зазначыў намеснік старшыні праўлення беларускай цэнтральнай біржы «Глорыя» Павел Ламека. —Не ўсё ж вымяраецца рублямі. Наша камерцыйная арганізацыя яшчэ маладая, але, жадаючы прыняць удзел у дабрачынных акцыях адраджэння нацыянальнай культуры, мы знайшлі сродкі фінансаваць буйную выстаўку-продаж у рэспубліканскай мастацкай галерэі.

— У апошні час становіцца ўсё больш відавочна, што наша галерэя не дачакаецца хоць якой фінансавай падтрымкі ад Міністэрства культуры і ад роднага Саюза мастакоў, — сказаў дырэктар галерэі Фёдар Ястраб. — Таму прыйшла думка звярнуцца за дапамогай да новых камерцыйных структур. Узаемаразуменне з «Глорыяй» мы знайшлі не на фінансавым узроўні, а на культурным. Супрацоўніцтва з гэтай біржай будзем працягваць. У планах галерэі, якая існуе ўсяго некалькі месяцаў, — аўкцыёны, асветніцкая дзейнасць і, самае галоўнае, — фарміраванне нацыянальнага фонду беларускага мастацтва.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

НА ЗДЫМКАХ: намеснік старшыні праўлення біржы «Глорыя» **П. ЛАМЕКА** і дырэктар галерэі **Ф. ЯСТРАБ;** сярод выстаўленых на продаж твораў пейзажы М. Чэпіка «Екацярынінская царква», Л. Дударанка «Вечар над возерам», ваза з шамоту А. Бычкоўскага.

ВАЧАМІ ЗАМЕЖНАГА ГОСЦЯ

Праблемы застаюцца

Сярод мноства арганізацый, якія асвойваюць беларускі рынак, і італьянская фірма «Новы праспект». Напрамак яе дзейнасці — маркетынг, пасрэдніцкія аперацыі, экспарт у Беларусь новых тэхналогій. Наколькі паспяховая яе работа, што перашкаджае эфектыўнай дзейнасці — пра гэта расказаў нашаму карэспандэнту віцэ-прэзідэнт фірмы Мауро МУРДЖЫА.

— Наша фірма працуе на тэрыторыі Беларусі некалькі гадоў. Але на першым часе аб поспехах гаварыць не прыходзілася. У наш адрас паступалі сотні прапаноў, але пры бліжэйшым знаёмстве аказвалася, што яны неканкрэтныя, бесперспектыўныя. І толькі калі наладзілі кантакт з «Беларусінгандлем», справы крыху палепшыліся, праз гэту арганізацыю мы прадалі многія італьянскія тавары. Паспяховым аказалася і правядзенне ў рэспубліканскім Палацы спорту выстаўкі італьянскай мэблі, на якой заключана шмат цікавых кантрактаў. У бліжэйшай перспектыве плануем адкрыць у Мінску пастаянна дзеючую выстаўку-продаж тавараў з Італіі. Цяпер вядзём перагаворы з Міністэрствам аховы здароўя па стварэнню цэнтра па перасадцы касцявога мозгу, ёсць іншыя цікавыя планы.

Аднак вымушаны заўважыць, што многія італьянцы баяцца ўкладваць сродкі ў развіццё вытворчасці, аказанне паслуг вашай рэспубліцы. І найперш таму, што не існуе міжнародных банкаўскіх механізмаў, якія давалі б гарантыю па ўкладах фірм. Напрыклад, Рэспубліка Беларусь — незалежная краіна, але італьянскі банк пакуль што не прызнаў беларускі як незалежны з міжнароднага пункту гледжання. І ўсе здзелкі будуць праходзіць праз маскоўскі банк. Іменна па гэтай прычыне ў нас ніяк не завершацца перагаворы на суму 200 мільярдаў італьянскіх лір.

У снежні ў рэспубліцы прынялі няблрэнны Закон аб замежных інвестыцыях, але няма дакладных юрыдычных механізмаў, якія гарантавалі б інвестытараў.

Плённа працаваць перашкаджаюць і іншыя прыкрыя, на наш погляд, дробязі. Калі ў Італіі, напрыклад, хто-небудзь хоча адкрыць магазін, яму дастаткова звярнуцца ў муніцыпалітэт. І там чалавеку ўсё растлумачаць. У Беларусі, як мы заўважылі, многія чыноўнікі баяцца прымаць рашэнні. Калі заводзім сур'ёзную размову аб маёмасці, ніхто адразу не скажа, каму яна належыць, колькі каштуе, ці варта траціць грошы і час на яе набыццё. Інакш кажучы, няма структуры, якая магла б дапамагчы разабрацца замежнаму бізнесмену ў існуючым заканадаўстве, узяла на сябе вырашэнне рада бытавых, адміністрацыйных праблем.

Вядома, усё гэта немагчыма без вопытных, кваліфікаваных кадраў. Разумеючы гэта, мы яшчэ летась унеслі на разгляд ЕЭС уласны праект праграмы павышэння кваліфікацыі кіраўнічых і адміністрацыйных кадраў у Рэспубліцы Беларусь.

АКТУАЛЬНА!

Беларусь рыхтуецца да штурму замежных рынкаў

Першай прыступкай гэтай зусім не сакрэтнай аперацыі стала распрацоўка канцэпцыі і праграмы падрыхтоўкі кадраў для знешнеэканамічнай дзейнасці.

ВЯДОМА, сёння армейская лексіка не ў модзе. Усялякія там працоўныя «бітвы», «вахты», «аперацыі», а тым больш «штурмы» лепш не ўжываць, каб не раздражняць чытача. Але што рабіць, калі слова вайскоўцаў трапна вызначае сэнс з'явы ці маючай адбыцца падзеі. Бо як яшчэ можна ўпэўнена замацавацца вытворцам прадукцыі на цяжкадаступных рынках свету без актыўнай атакі на іх, шырокай таварнай інтэрвенцыі? Апошняе, праўда, замежным рынкам з боку Беларусі пакуль не пагражае.

Раптоўная і канчатковая незалежнасць ад Масквы як цэнтра палітычнай і эканамічнай улады былога СССР рэзка абвастрыла ў рэспубліцы многія дэфіцыты. Напрыклад, пасля набыцця суверэнітэту зусім відавочным стаў катастрафічны недахват спецыялістаў, якія маглі б весці, скажам так, нармальны бізнес з замежжам. Сёння больш за тры тысячы беларускіх прадпрыемстваў і арганізацый атрымалі права самастойна займацца знешнеэканамічнай дзейнасцю. А кваліфікаваных кадраў для гэтай перавважна чыста «маскоўскай» работы ў Беларусі, паводле розных ацэнак,— ад 150 да 200.

Раней кадры для знешнеэканамічнай работы пастаўляла нам Масква, у прыватнасці Акадэмія знешняга гандлю. Але яе выпускнікі — пасланцы рэспублікі — потым з вялікай цяжкасцю знаходзілі месца. Добра, як правіла, уладкоўваліся так званыя «інваліды» — у каго была трэцяя «валасатая рука» ў Саўміне ці ЦК. Неінваліды ў асноўным працавалі не па спецыяльнасці. Гэта потым іх адшукалі і прапанавалі службу ў знешнеэканамічных арганізацыях.

Першымі адгукнуліся на патрэбу тады яшчэ савецкіх рэспублік у кадрах гэтай кваліфікацыі шматлікія кааператывы, якія спрабавалі свае сілы ў замежным турызме. Яны хуценька знайшлі за мяжой партнёраў, і экраны тэлебачання, друк запаланілі аб'явы аб шыкоўных круізах па свеце, у ходзе якіх паміж экскурсіямі чыталіся лекцыі аб заходняй рыначнай эканоміцы, выдаваліся нейкія сертыфікаты, дыпломы. Эканамічны лікбез на белым параходзе па Чорным моры наўрад ці можна лічыць сур'ёзнай школай бізнесу.

І калі гэта праблема стала, як кажуць, ва ўвесь рост, у рэспубліцы вырашылі фарсіраваць справу падрыхтоўкі кадраў для бізнесу з Захадам, эканамічнымі «драконамі» Усходу. З гэтай нагоды стварылі пад эгідай Камітэта па знешніх эканамічных сувязях творчы калектыў па распрацоўцы адпаведнай праграмы. У групу з васьмі чалавек запрасілі найбольш кваліфікаваныя сілы рэспублікі ў гэтай сферы. Узначаліла яе І. Махоркіна, намеснік начальніка ўпраўлення прагназіравання знешнеэканамічнай дзейнасці, інфармацыі і падрыхтоўкі кадраў Камітэта.

Вынікам шматмесячнай напружанай працы калектыву сталі канцэпцыя і праграма па пытаннях падрыхтоўкі кадраў для знешнеэканамічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. З палажэннямі канцэпцыі і праграмы, якія былі зацверджаны Саўмінам, мы вас пазнаёмім ніжэй, а пакуль хочацца сказаць вось пра што.

Стваральнікі праграмы яшчэ на этапе яе распрацоўкі былі пастаўлены ў жорсткія ўмовы: пры мінімуме фінансавых затрат у даволі сціслыя тэрміны падрыхтаваць як мага больш кваліфікаваных спецыялістаў. Вядома, можна было б па прыкладу Масквы арганізаваць сваю Акадэмію знешняга гандлю, адкрыць паступова школы бізнесу, але на гэта, паводле папярэдніх няпоўных падлікаў, спатрэбілася б 140 мільёнаў рублёў.

Па-другое, літаральна па пальцах можна пералічыць выкладчыкаў, здольных чытаць курсы лекцый па знешнеэканамічнай дзейнасці. А без іх якую акадэмію, школу бізнесу адкрыеш?

Нашы кадравыя праблемы, думаецца, добра ўяўляюць на Захадзе. Каб пераканацца ў іх, дастаткова раз-другі дзеламому чалавеку «адтуль» сустрэцца з нашымі хуткаспелымі прадпрымальнікамі, якія, нярэдка, акрамя гарачага жадання рабіць бізнес у якой-небудзь заходнееўрапейскай краіне з высокім узроўнем жыцця, за душой нічога не маюць. Калі не лічыць маладосці, імпэту, моднага касцюма і гальштука ды «дыпламата». Гэтыя прадпрымальнікі ўпадаюць у эйфарыю ад слоў «кантракт», «лізінг», «клірынг» і г. д.

У сумленнага заходняга бізнесмена гэта бравада ў лепшым выпадку выкліча ўсмешку, а ў прайдзісвета (іх таксама шмат за мяжой) — ахвоту няблага зарабіць на нявопытнасці і даверлівасці партнёра з былога СССР. Не сакрэт, што часта за гучнай назвай замежнай фірмы, яркай візітнай карткай нічога істотнага не стаіць. Офіс фірмы — сціплая кватэрка не ў лепшым раёне. Гаспадары фірмы — муж і жонка, якія па чарзе «сядзяць» на тэлефоне і адказваюць на званкі. Знаёмствам з такімі вось «фірмачамі» ганарацца нашы маладыя бізнесмены, глядзяць ім у рот. У выніку час ад часу «гараць» на здзелках з невядомымі фірмамі.

Атрымаць жа дакладную інфармацыю аб патэнцыяльным замежным партнёры — для нашых бізнесменаў задача пакуль што з многімі невядомымі. Гэта на Захадзе ёсць адпаведныя службы пры банках, буйных карпарацыях, існуюць кансультацыйныя канторы, якія за пэўную плату падкажуць, варта ці не варта мець справу са шматабяцаючым панам і яго фірмай.

Праўда, ёсць раскіданыя па свеце гандлёвыя прадстаўніцтвы былога СССР, якія маглі б прадастаўляць гэту інфармацыю. Але там сядзяць хлопцы, не лыкам шытыя. З гандлёвага прадстаўніцтва ў Швецыі даслалі ў Мінск прэйскурант паслуг у валюце: адзін факс каштуе столькі, тэлекс — столькі, за старонку тэксту інфармацыі — зусім шалёныя грошы. Там у іх цяпер гаспадарчы разлік. Відаць, не хочуць з прыемнай ва ўсіх адносінах Швецыі вяртацца ў халодную і галодную Маскву. Галоўная перашкода— наша беднасць, хранічная адсутнасць валюты.

— Таму мы вымушаны прымаць толькі такія прапановы, дзе навучанне будзе аплачваць прымаючы бок. І калі ён дае згоду, то мы імкнёмся накіраваць на вучобу маладых перспектыўных спецыялістаў. Дарэчы, у нас ёсць банк даных аб гэтых людзях. Толькі, на жаль, не ўсе з іх валодаюць мовай краіны, куды ёсць магчымасць паехаць за навукай, што таксама нярэдка становіцца перашкодай,— гаворыць Ірына Уладзіміраўна.

Тым не менш — едуць. І гэта добра. Праслухаць курс па менеджменту ці маркетынгу пачынаючаму бізнесмену, скажам, у Германіі (туды днямі выязджае з Беларусі група),—вялікі стымул у далейшай працы. Увогуле, з немцамі складваюцца канструктыўныя адносіны. Напрыклад, са школамі бізнесу ў Кёльне і Гановеры, з Мюнхенскай акадэміяй менеджменту.

Абяцаюць быць плённымі першыя кантакты з Францыяй. Нядаўна там 20 чалавек з Беларусі месяц вучыліся па ўрадавай праграме. За час навучання ўдалося наладзіць сувязі са школай бізнесу ў Ліёне і Цэнтрам «Сезі», што ў прыгарадзе Парыжа. Калі ўсё будзе добра, то, магчыма, неўзабаве філіял гэтай школы адкрыецца ў Мінску. Зараз распрацоўваюцца адпаведныя дакументы. А ў «Сезі» гатовы прымаць нашых пасланцоў. Грошы на іх вучобу, як мяркуецца, будуць выдаткаваны з фондаў Еўрапейскага супольніцтва. Ёсць магчымасць накіраваць нашых спецыялістаў у ЗША, Англію, Італію.

І ўвогуле, чым больш дзелавых людзей з Беларусі будзе выязджаць у камандзіроўкі за мяжу — тым лепш для рэспублікі.

Бізнес з Захадам — справа тонкая. Каб авалодаць ёй, не тыдні і месяцы — гады патрэбны. Лёгка прадаваць сыравіну (нафту, лес, вугаль), займацца бартэрнымі здзелкамі ці прадаваць машыны па нізкіх да смешнага цэнах. Значна цяжэй прабіцца са сваім таварам на насычаны разнастайнымі вырабамі сусветны рынак, знайсці яшчэ не занятую вытворцамі нішу. Атрымліваецца ж гэта ў Тайваня, Кітая, Сінгапура, Тайланда. А мы чым горшыя?

Да ўвагі бацькоў таленавітых дзяцей! Мяркуецца стварыць сетку ліцэяў, у школах — класы падрыхтоўчых груп і курсаў, арыентаваных на далейшую вучобу іх выпускнікоў у эканамічных інстытутах з прыцэлам на вядзенне бізнесу з Захадам.

Не забыты студэнты, якія нядаўна паступілі ці ўжо правучыліся два-тры гады. Ім, магчыма, будзе прапанавана спецыялізацыя: валютна-фінансавыя і крэдытныя адносіны, бухгалтарскі ўлік знешнеэканамічнай дзейнасці, маркетынг, бухулік СП, таварная біржа, фондавая біржа, арганізацыя знешнеэканамічных сувязей, прававое рэгуляванне знешнеэканамічнай дзейнасці, міжнародны маркетынг, арганізацыя дзелавых перагавораў і г. д. Перападрыхтоўка дыпламаваных спецыялістаў будзе весціся на гасразліковай аснове.

Асаблівыя надзеі ўскладаюцца на падрыхтоўку кадраў высокага палёту праз аспірантуру і дактарантуру. Ім будзе даручацца работа найскладанейшая: распрацоўка праблем рыначнай эканомікі і знешнеэканамічнай дзейнасці, даследаванні па яе асобных накірунках.

Ажыццяўленне вышэйпералічаных мэт запатрабуе шмат вучэбна-метадычных і інфармацыйных матэрыялаў. А для гэтага ўжо час думаць пра адпаведныя службы, цэнтры па іх распрацоўцы пры Акадэміі кіравання пры Саўміне, інстытуце народнай гаспадаркі, які нядаўна пераўтвораны ў Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт.

Хто ведае, можа і сапраўды Беларусь стане чарговым эканамічным «драконам»?

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

БЕЛАРУСКІ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ТЭХНАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ С. М. КІРАВА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД

загадчыка кафедры аховы лесу;

дацэнта кафедры лесаўпарадкавання (па спецыяльнасці — геадэзія);

выкладчыка рускай мовы як замежнай;

старшых выкладчыкаў кафедраў

вылічальнай тэхнікі (кандыдат навук),

фізвыхавання і спорту (лыжныя гонкі і біятлон).

Тэрмін падачы дакументаў — месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы высылаць па адрасу: 220630, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13-а, БТІ імя С. М. Кірава, аддзел кадраў.

Віншаванне

ДЗЯЎЧАТЫ 9-Б КЛАСА 75 ШКОЛЫ Г. МІНСКА ВІНШУЮЦЬ АДНАКЛАСНІКАЎ СА СВЯТАМ МУЖЧЫН. ЛЕПШ ПАЗНЕЙ, ЧЫМ НІКОЛІ!

«СПОРТЛАТО»

Вынікі 8-га тыражу латарэі «Спортлато».

«6 з 45:
43—36—34—16—45—41.

«5 з 36»:
12—33—1—36—4.

У Тэль-Авіў — за 180 хвілін

Усяго 3 гадзіны і 20 мінут запатрабуецца цяпер тым, хто ад'язджае з Беларусі ў Ізраіль, калі яны выкарыстаюць паслугі авіяслужбы.

У сталіцы рэспублікі днямі адкрыўся новы авіярэйс «Мінск—Тэль-Авіў». Ён адразу ўзяў на сябе клопаты аб перамяшчэнні каля 100 пасажыраў. Бясплатныя білеты будучым жыхарам Ізраіля прадаставіла сусветнае яўрэйскае агенцтва «Сохнут». Як паведаміў яго пастаянны прадстаўнік у рэспубліцы пан Доў Шарфштэйн, паміж Беларуссю і Ізраілем штомесяц плануюцца два прамыя авіярэйсы.

Пры неабходнасці іх колькасць будзе павялічана.

РэзГАЛАС

ПАВІНШУЕМ АДЗІН АДНАГО: ЦЯПЕР МЫ—РЭЦЫПІЕНТЫ

А сталі мы рэцыпіентамі пасля нядаўняй сесіі савета кіраўнікоў ПРААН, або «Праграмы развіцця» ААН.

Аднак растлумачу, што гэта азначае. ПРААН—гэта міжнародная арганізацыя (хутчэй — міжнародны фонд), якая валодае пэўнымі сродкамі для дапамогі краінам, што развіваюцца, або, як раней было прынята гаварыць,—слабаразвітым. Згодна з палажэннем, дапамога аказваецца тым, у каго валавы нацыянальны даход на душу насельніцтва [illegible]. Гэтыя краіны і называюцца рэцыпіентамі. Адпаведна, краіны, за кошт якіх фарміруюцца сродкі фонду,— донары.

Дык вось, цэнтральным пытаннем указанай сесіі і стаў разгляд просьбы Беларусі [illegible] прадаставіць статус краіны—атрымальніка дапамогі. [illegible]

Праўда, невядома: больш радавацца гэтаму факту ці засмучацца? [illegible]

Супакоім сябе тым, што ў рэцыпіенты падаліся таксама Украіна і краіны Балтыі, што Беларусь таксама рабіла калісьці ўзносы ў гэты фонд. [illegible] Зразумець, як бы там ні было, за працягнутую руку дапамогі, відома, трэба падзякаваць.

У той жа дзень, адразу пасля [illegible] Дзяржкамтэлефонрадыё Беларусі [illegible] з журналістамі сустрэўся міністр замежных спраў рэспублікі П. Краўчанка і віцэ-прэзідэнт Камісіі еўрапейскіх супольнасцей Франц Андрыесен.

Як адзначыў госць Беларусі, гэта першы з чатырох запланаваных ім візітаў у краіны СНД. Мэта — вывучэнне эканаміка-палітычнай сітуацыі, каб ведаць, як развіваць далейшыя адносіны з краінамі СНД, і [illegible] Беларусі.

І ў заключэнне паведамім: Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі выехаў у Хельсінкі, каб паставіць подпіс пад Заключным актам Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. [illegible]

Кар. «Звязды».

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

ГАНІ, САШКА, У МАГДЭБУРГ!

Як ужо паведамлялася, у Кобрыне сярод белага дня выкрадзены аўтамабіль «ВАЗ-2101». Мацёрымі ўгоншчыкамі аказаліся 14-гадовы Максім і 15-гадовы Сашка, жыхары Луганскай вобласці.

А перад гэтым яны нешта не падзялілі з аднагодкамі і, каб развеяць крыўду, вырашылі паехаць у нямецкі горад Магдэбург, дзе нядаўна жыў адзін з іх, сын ваеннаслужачага. Вось толькі не разлічылі хлопцы з грашыма і ў Кобрыне «селі на мель». Тут раптам і натрапілі на незачынены аўтамабіль. У аднаго з падлеткаў былі ключы, якія падышлі да [illegible] запальвання.

...На чарговым кіламетры «аўтатурысты» [illegible] заехалі ў канаву. Невядома, ці больш з перапуду, ці то захопленыя мэтай нягледзячы ні на што даехаць да Магдэбурга, знайшлі трактар, выцягнулі машыну. Аднак ужо цямнела, таму вырашалі заначаваць. Дзядок з бліжэйшай хаты вёскі Язоўня Ратнаўскага раёна пусціў іх на начлег за «бутэльку». Тут іх і «накрыў» мясцовы ўчастковы...

Рыгор ПАЛЯШУК.
БелаПАН.

АЛЬБЕРВІЛЬ-92

ГЭТА БЯСКОНЦАЕ АЛІМПІЙСКАЕ ЖЫЦЦЁ...

Патух алімпійскі агонь у Альбервілі. На працягу двух тыдняў сэрцы мільёнаў аматараў зімовых відаў спорту былі там, у сталіцы Гульняў XVI Алімпіяды, на арэнах якой прадстаўнікі 64 краін свету вызначалі самых моцных, дужых і спрытных атлетаў.

Як і чакалася, неафіцыйную агульнакамандную перамогу атрымала каманда Федэратыўнай Рэспублікі Германія. 10 залатых узнагарод на рахунку спартсменаў гэтай краіны. Па дзевяць медалёў вышэйшай пробы заваявалі прадстаўнікі Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Нарвегіі. А ўвогуле шчаслівымі ўладальнікамі ўзнагарод альбервільскай чаканкі сталі спартсмены 20 краін, у тым ліку такіх, як Новая Зеландыя, Кітай, Паўднёвая Карэя, Японія, дзе зімовыя віды спорту зусім не «папулярныя».

Як вядома, першую залатую ўзнагароду Алімпіяды-92 заваявала спартсменка СНД лыжніца Любоў Ягорава. І апошні медаль вышэйшай пробы дастаўся нам — яго ўладальнікам сталі хакеісты зборнай Садружнасці. У вострай, напружанай і бескампраміснай барацьбе яны выйгралі фінальны матч у каманды Канады з лікам 3:1. Два перыяды варатары Міхаіл Шталянкоў і Шон Бурк трымалі вароты на «замках», і толькі ў заключнай дваццацімінутцы дала аб сабе знаць перавага нашых майстроў. Шайбы ў зборнай СНД закінулі Яўген Давыдаў, Ігар Болдзін, Вячаслаў Быкаў, у канадцаў — Крыс Ліндберг.

Вынікі Алімпійскіх гульняў у Альбервілі ўпісаны, такім чынам, у спартыўны летапіс. Доўга і падрабязна будуць яшчэ аналізаваць іх самі спартсмены, іх трэнеры, спецыялісты, аматары спорту. А пакуль што па гарачых слядах спаборніцтваў можна сказаць адназначна: зборная Садружнасці Незалежных Дзяржаў выступіла на іх пасяхова. Пад белым алімпійскім сцягам у саставе каманды Садружнасці выступалі прадстаўнікі пяці суверэнных дзяржаў СНД: Расіі, Украіны, Беларусі, Казахстана і Узбекістана. Вядома, маглі і павінны былі выступіць лепш пасланцы нашай рэспублікі, і найперш неаднаразовыя чэмпіёны свету канькабежац Ігар Жалязоўскі і біятланістка Святлана Парамыгіна, аднак... Але не будзем папракаць іх: цягнік, як кажуць, пайшоў.

Цяпер думкі і памкненні спартсменаў і іх настаўнікаў скіраваны на летнія Алімпійскія гульні, якія праз некалькі месяцаў пройдуць у Барселоне. Спартсмены былога Саюза ССР і там выступяць аб'яднанай камандай. Сёння на паездку ў Іспанію рэальна прэтэндуюць каля трох дзесяткаў выхаванцаў беларускай фізкультурнай арганізацыі. А там недалёка і да чарговай зімовай Алімпіяды: як вядома, Міжнародны Алімпійскі Камітэт прыняў рашэнне праводзіць іх цяпер не праз чатыры гады, як раней, а праз два. Наступная сустрэча «зімовых» алімпійцаў, такім чынам, — у 1994-м, у нарвежскім горадзе Ліліхамеры.

Алімпійскае жыццё бясконцае...

ЗЛАЧЫНЦЫ ЗАТРЫМАНЫ

ТАЛАЧЫН (Т. Махтадуй). Сярод белага дня ў гарадскім пасёлку Крупкі адбылося разбойнае нападзенне на ўладальніка аўтамабіля «Форд». Двое злачынцаў, адзін з якіх быў апрануты ў форму старшыны міліцыі, спынілі машыну і, пагражаючы нажом, прымусілі вадзіцеля выйсці з яе. Затым на вялікай скорасці пагналі аўтамабіль па аўтамагістралі Мінск — Масква ў бок Талачына.

Тут і спрацавалі, можна сказаць, на «выдатна» работнікі Талачынскага аддзялення ДАІ РАУС С. Гірвень і А. Цярэнцьеў. У затрыманні злачынцаў удзел прынялі таксама супрацоўнікі міліцыі Л. Смалоўскі і М. Барнадскі, якія дзейнічалі рашуча і прымянілі агнястрэльную зброю.

З МІЛІЦЫЯЙ НЕ ЖАРТУЮЦЬ

Пракуратура Заводскага раёна г. Мінска ўзбудзіла крымінальную справу ў адносінах да 17-гадовага Віктара С. Раней ён ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзеж асабістай і дзяржаўнай маёмасці, аднак, улічваючы яго маладосць, суд прымяніў да яго адтэрміноўку выканання прысуду на 2 гады. Аднак урок не пайшоў на карысць: у нецвярозым стане падлетак учыніў скандал у кафэ «Вега», а калі яго затрымала міліцыя, нанёс некалькі ўдараў кулаком у твар патрульнаму сяржанту. С. затрыманы. Органы пракуратуры вядуць следства, пасля заканчэння якога хуліган сядзе на лаву падсудных, а потым будзе накіраваны ў «месцы, не вельмі аддаленыя». Да вызначанага тэрміну пазбаўлення волі прыплюсуецца і тэрмін першай судзімасці.

ХТО ЁСЦЬ ХТО

Што рабіць, калі цэны павышаюць, а дачка не можа выйсці замуж,

або Пра карысць клізмы як дзейснага сродку палітычнага і дэмаграфічнага ўрэгулявання

Якімі толькі эпітэтамі не ўзнагароджвае прэса старшыню Ліберальна-дэмакратычнай партыі Уладзіміра Жырыноўскага: «фашыст», «комік», «адзіны прыстойны чалавек», «агент КДБ», «патрыёт», «вар'ят»... І, верагодна, кожны з іх можна падмацаваць цытатай з яго выступленняў. Хто ж ён на самай справе? Не буду навязваць чытачу сваю думку — няхай кожны зробіць вывады сам, прачытаўшы, напрыклад, прапануемы ніжэй урывак з доўгай і шматчасткавай праграмнай прамовы Жырыноўскага на мітынгу за вызваленне асуджаных па справе ГКЧП, які адбыўся ў Маскве 21 снежня 1991 г.

«...Слова «перабудова» ўжо не дзейнічае на вас, вы ўжо працверазіліся. І вам гавораць: «Падтрымаем усе ДДР!» А вы ім скажыце: «Дулю вам!!!» І рвіце іх газеты! Яны зашамацелі зараз, што дорага будзе выпускаць гэтую «Комсомольскую — ілжывую — праўду» і іншыя газеты. Але нават калі яны будуць іх выпускаць — вы купляйце і рвіце ля кожнага кіёска гэту хлуслівую жоўтую прэсу! Выпісвайце і купляйце газету маёй партыі — «Юридическую газету», мой часопіс «Либерал». Там праўда аб краіне. Там праўда пра мяне. Там праўда аб партыі.

Можаце і іншых падтрымліваць, калі вы задаволены жыццём, калі вы сытыя, дома цёпла, дачка добра выйшла замуж, сына не пабілі, ён добра вучыцца, стане спецыялістам, бацькоў спакойна пахавалі, калі ім было 90 гадоў. Тады галасуйце за гэтых. Але калі вашы бацькі памёрлі ў 60 гадоў, на 30 гадоў раней, калі дачка не можа выйсці замуж, калі сына забіваюць, калі няма работы, калі цэны павышаюць, калі дома няма цяпла, — тады падумайце, за каго галасаваць.

Вы мне гаворыце: «А што ты зробіш?» А што яны вам зрабілі за тое, што вы ім аддалі свае галасы? А вось цяпер я скажу, што я зраблю.

Што трэба рабіць? СССР няма, ёсць СНД, прэзідэнта няма, нічога няма. Арміі няма, міліцыі няма. КДБ няма. Ёсць 11 незалежных дзяржаў, у якіх кожны робіць усё, што хоча. Яны анулююць дагавор 1922 года. Але тады мы павінны вярнуцца да межаў РСФСР, якія былі ў 1922 годзе. Тады ў межы РСФСР уваходзілі Казахстан, і Кіргізія, і Крым. Усё, што было ў РСФСР 29 снежня 1922 года, павінна быць зноў у саставе РСФСР. Але ж Ельцын не юрыст. Ён будаўнік...

Калі яны падпісалі дагавор аб СНД, мы з вамі павінны патрабаваць агульнага прэзідэнта для гэтай СНД, федэральнага прэзідэнта. Але яны пабаяцца гэта зрабіць. Таму што вы больш не прагаласуеце за людзей накшталт Гарбачова, Ельцына, Сабчака і іншых, а можаце прагаласаваць за мяне — гэтага яны і баяцца. Па краіне за мяне ўжо 70 працэнтаў будучых выбаршчыкаў.

Паглядзіце на акружэнне Ельцына: першы віцэ-прэм'ер — Генадзь Бурбуліс — ён літовец, хоць і прыкідваецца ўкраінцам. Парламентам чэчэнец кіруе. Першы эканаміст — Гайдар; самі разумееце, адкуль гэтая каманда. Уся каманда Ельцына — гэта здраднікі, уся каманда — антыруская. Калі паставіць на чале парламента рускага — хіба ён будзе прызнаваць тое, што адбываецца ў Прыднястроўі? Ён войскі накіруе туды! Гэтыя малдаване будуць уцякаць далей Бухарэста! А паставілі чэчэнца — і маўчыць рускі парламент. Тое ж самае Бурбуліс — яму важная Літва, а не Расія. І так на кожным кроку. Мэр Масквы — грэк. Дзе ж рускім месца??? Дзе??? У балотах за Архангельскам і Волагдай!!! Вось чаго яны хочуць!!! А вы гэтага не можаце зразумець.

Зразумейце, вас падманваюць усе — і камуністы, і дзермакраты. Таму, каб не думаць: «А каму ж мне паверыць?» — вось і паверце мне і маёй партыі. Паверце, і вы ўбачыце: парадак будзе жорсткі, я загадзя гавару. Але ж я не падманваю! Што я зраблю? З моманту прыходу да ўлады або праз выбары, ці калі ваенныя зробяць тое, на што маюць поўнае права, выконваючы свой абавязак па абароне Канстытуцыі, — я неадкладна прывяду ўсе Узброеныя Сілы пад маё адзінае камандаванне. Ніякай нацыяналізацыі Узброеных Сіл! Усе арміі, усе флаты, КДБ, міліцыю— усё пад маё адзінае камандаванне. З Крамля толькі я адзін буду кіраваць гэтай магутнай і апошняй апорай рэжыму.

Далей я ліквідую ўсе рэспублікі. Ні адной рэспублікі — будзе толькі Расійская Федэрацыя. Будуць губерні, землі, вобласці, але без нацыянальных прыкмет. Расія для ўсіх, але тут рускія не павінны быць людзьмі другога сорту. Уся аўтаномія — у рамках культуры — калі ласка.

Армія адзіная, і там будуць служыць толькі славяне. Толькі рускія, украінцы і беларусы. Поўдзень служыць там не будзе. Яны не хочуць — няхай вырошчваюць мандарыны і пасвяць авечак. Аднаўлю па ўсім поўдні казацкія дывізіі і акругі і даручу рускім казакам ахоўваць паўднёвыя рубяжы Айчыны.

У першы ж дзень я выдам Указ аб заахвочванні арміі і дазволю афіцэрам выкарыстоўваць зброю ў любы час пры любой небяспецы. Любое зневажанне афіцэра арміі ці міліцыі — і расстрэльваць на месцы!!! Ніхто не мае права зневажаць армію, КДБ, міліцыю!!! Гэта падпарадкаваныя МНЕ сілы!!! Я — ваш прэзідэнт, і я вас буду абараняць ад злачынцаў.

За 72 гадзіны я выкіну з усіх гарадоў Расіі паўднёвую мафію. Увесь рыжскі і вільнюскі АМАН будзе маёй асабістай гвардыяй і будзе знаходзіцца ў Крамлі. На два гады я закрыю ўсе палітычныя партыі. У тым ліку — і сваю таксама. На два гады.

Я закрыю міжнародны аэрапорт Шарамецьева з тым, каб ні адзін пацук не збег з нашымі грашыма. Я дам свабоду выезду з краіны, але толькі з асабістымі рэчамі — зубная шчотка, клізма, ручнік».

І гэтак далей. Гаварыць Уладзімір Вольфавіч можа, мяркуючы па ўсім, гадзінамі і на самыя розныя тэмы, таму любы пераказ будзе няпоўным. Неабходна, аднак, дабавіць, што ўсё вышэйвыкладзенае гучала далёка не пры магільным маўчанні акружаючых. Апладысменты і воклічы: «Правільна!», «Малайчына!» гучалі амаль няспынна і не толькі ад расканцэнтраваных у натоўпе членаў ЛДП... Няхай кожны сам зробіць з усяго гэтага вывады.

Запісаў
Анатоль АНІСІМАЎ.
ІС «Для всех».

Запіс зроблены на санкцыяніраваным мітынгу ля метро «Сакольнікі» ў Маскве 21 снежня 1991 года. Магнітафонная плёнка з запісам знаходзіцца ў аўтара.

Такім чынам, паважаныя чытачы, усяго за некалькі хвілін вы атрымалі максімум карыснай і універсальнай інфармацыі. Што рабіць, калі ваша дачка не можа выйсці замуж, калі няма работы, павышаюць цэны, а дома не знайсці цёплага прытулку? Вядома ж, выбраць у прэзідэнты Уладзіміра Вольфавіча Жырыноўскага! Найлепшы сродак ад усіх няшчасцяў! Відаць, гэткі ж, як згаданая ім клізма ад усіх вядомых і невядомых хвароб. Проста, але эфектыўна! Хто сумняваецца, можа праверыць.

А можна прыбегнуць да вопыту тых, хто, відаць, правяраў. Той жа ІС «Для всех» суправаджае «цытатнік» рэдакцыйнай заўвагай: «Жырыноўскі гаворыць услых тое, аб чым многія думаюць, але пераважна маўчаць. Так што да вывадаў Жырыноўскага, раяць чытачу, трэба ставіцца ўважліва — яны могуць аказацца прадказаннямі будучыні. І застаецца толькі пашкадаваць у гэтай сувязі недальнабачных мінчан, якія ўпусцілі выключны шанц, падараваны лёсам, так нешаноўна спусціўшы Уладзіміра Вольфавіча з прыступак Палаца спорту. А раптам прадказальнік будучыні, перамогшы камуністаў і дэмакратаў, прыпомніць старыя крыўды і забароніць беларусам пры вельмі свабодным выездзе прыхапіць нават вызначаны ім «джэнтльменскі набор»? Бо ёсць крыўда, ёсць! Каторы месяц ігнаруе Жырыноўскі шчырыя запрашэнні ў Мінск, што зыходзяць ад органаў правасуддзя. Што яму да замежнай, лічы, дзяржавы? Сам закідаў суды белакаменнай заявамі на тых, хто праявіў, на думку істца, непачцівасць да яго асобы. Каб жа потым не каяліся.

Калі вы адмаўляецеся (ці сумняваецеся) мець прэзідэнтам (невядома чаго) Жырыноўскага, то «дулю вам!», а не цвёрда гарантаваныя замужжа дачкі, зніжэнне цэн (у тым ліку і на даўно абяцаную гарэлку), і «законную» смерць у 90 гадоў. Бярыце ўласныя ручнік, зубную шчотку, клізму ў рукі (наконт апошняй рэкамендацыі могуць быць і іншымі) — і ў свабодны палёт, у абяздоленыя адсутнасцю пана Жырыноўскага краіны. Іначай, па ўсім відаць, з дапамогай вашай жа клізмы вам добра прачысцяць мазгі: парадак будзе «жорсткі, але без падману». Уладзімір Вольфавіч — не літовец, не грэк, не будаўнік. Ён... А вось гэта вырашае кожны самастойна. Думкі, як і прадметы інтымнага туалету, павінны быць выключна для асабістага ўжытку.

ЗАМЕЖЖА

ДЗЕ ЖЫВУЦЬ «ШЧАСЛІЎЧЫКІ»

ВАЛЕТА. Мальтыйцы — найбольш задаволеная сваім жыццём нацыя сярод усіх заходнееўрапейцаў. Да такога вываду прыйшлі спецыялісты інстытута Гэлапа, якія правялі серыю апытанняў грамадскай думкі ў краінах Заходняй Еўропы з мэтай высветліць ступень задаволенасці еўрапейцаў сваім жыццём.

У ходзе апытання 39 працэнтаў мальтыйцаў заявілі, што яны «вельмі шчаслівыя», а 73 працэнты ўказалі, што ганарацца тым, што з'яўляюцца мальтыйцамі. Мяркуючы па ўсім, прычыну такой вялікай колькасці «шчасліўчыкаў» трэба шукаць не ў нацыянальным характары ці ўласцівым мальтыйцам аптымізме, а ў змененых умовах жыцця: калі аналагічнае пытанне было зададзена тут у 1983 годзе, толькі 13 працэнтаў апытаных змаглі адказаць на яго станоўча, што, дарэчы, тады дало спецыялістам падставу назваць жыхароў вострава «самымі няшчаснымі» заходнееўрапейцамі.

АД УСМЕШКІ ХМУРНЫ ДЗЕНЬ СВЯТЛЕЙШЫ

МАСЕРУ. «Стаўцеся да ўсмешкі з усёй сур'ёзнасцю!» — заклікае прафесар медыцыны з Кейптаўна Ісайя Пілоўскі. Даследаванні, праведзеныя ім з дапамогай навейшых метадаў, уключаючы створаныя на камп'ютэрах «мадэлі смеху», паказалі, што пры ўсмешцы мышцы твару ствараюць асаблівыя імпульсы, якія дабратворна ўплываюць на нервовую сістэму і работу мозга, здымаючы напружанне.

Нават калі вам сумна і вы выціскаеце з сябе фальшывую ўсмешку, механізм спрацоўвае, і на душы становіцца некалькі лягчэй, сцвярджае вучоны. Ён перакананы, што смех — гэта выпрацаваны людзьмі «сацыяльны рэфлекс». Наогул, як заўсёды маюць рацыю старажытныя людзі, што пакінулі нам мудрае выказванне: «Усміхайцеся, і свет усміхнецца вам».

ДВА ГАДЫ ЗА АПЛЯВУХУ

ЛІСАБОН. Крымінальным злачынствам у Партугаліі з гэтага часу лічыцца... аплявуха, і тым, хто выкарыстоўвае далоні ў якасці апошняга аргумента, пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да двух гадоў і буйны штраф на карысць пацярпеўшага.

Такое рашэнне прыняў Вярхоўны суд Партугаліі, які разгледзеў справу аднаго з абвінавачаных. У пастанове суддзяў удакладняецца: «Аплявуха — гэта ўдар, нанесены далонню па твары... Гэтая свядомая агрэсія супраць фізічнай цэласнасці чалавека падлягае пакаранню, нават калі пацярпеўшы не атрымаў ранення і не страціў часова працаздольнасці».

Для вызначэння саставу гэтага віду злачынства Вярхоўны суд выкарыстаў каралеўскія ўказы, якія дзейнічалі ў Партугаліі некалькі стагоддзяў назад.

НЕ БОЙЦЕСЯ МІКРАХВАЛЕВЫХ ПЯЧЭЙ

ЖЭНЕВА. Мікрахвалевыя печы, якія набываюць усё большую папулярнасць сярод хатніх гаспадынь, не ўяўляюць небяспекі для здароўя чалавека, калі іх эксплуатацыя на кухні адпавядае прадпісанням фірмы-вытворцы. Чуткі аб тым, што ў ходзе прыгатавання страў у гэтых печах утвараюцца розныя ядавітыя рэчывы, не адпавядаюць рэчаіснасці і не пацвярджаюцца ніводным са шматлікіх навуковых даследаванняў. Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджанай тут заяве Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

Галоўнай перадумовай для бяспечнага прымянення мікрахвалевых пячэй з'яўляецца дакладнае захаванне правіл прыгатавання прадуктаў — праграванне іх пры пэўнай тэмпературы на працягу мінімуму часу, неабходнага для знішчэння хваробатворных арганізмаў, якія могуць знаходзіцца ў сырых прадуктах і паўфабрыкатах.

ЦІ СТАНЕ МЕХІКА ЧЫСЦЕЙШЫМ?

МЕХІКА. Гарадскія ўлады Мехіка абнародавалі дадатковыя меры па ахове навакольнага асяроддзя з прычыны прыкметнага пагаршэння экалагічнай абстаноўкі ў сталіцы, зарэгістраванага ў апошнія дні.

Пры ўзроўні забруджанасці паветра звыш 250 пунктаў па шкале, распрацаванай мясцовымі спецыялістамі ў адпаведнасці са стандартамі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, прамысловыя прадпрыемствы горада будуць працаваць на 60—70 працэнтаў сваёй магутнасці. Уводзяцца абмежаванні на выкарыстанне аўтатранспарту ў дзяржаўных установах, адмяняюцца рамонтныя і малярныя работы на вуліцах, укладка асфальту.

Пры 350 пунктах прадугледжваецца далейшае зніжэнне магутнасцей заводаў і фабрык, увядзенне праграмы «Два дні без машыны» для ўсіх без выключэння ўладальнікаў аўтамабіляў, адмена заняткаў у школах. Калі ж узровень смогу перавысіць 450 пунктаў, у Мехіка будзе спынена ўсялякая працоўная і вытворчая дзейнасць.

У мінулы панядзелак узровень забруджанасці паветра ў Мехіка перавысіў 330 пунктаў. На думку ўрачоў, пагроза для здароўя людзей наступае пры значна меншых канцэнтрацыях шкодных рэчываў у атмасферы.

СВОЕАСАБЛІВЫ РЭКОРД

Яго ўстанавіў італьянскі мастацтвазнаўца і літаратурны крытык Віторыо Згарбі, які ўзначальвае адзін з аддзелаў дэпартамента культурнай спадчыны вобласці Венета. У перыяд з 1 чэрвеня 1987 года па 12 кастрычніка 1988 года ён быў на рабоце... толькі тры дні. Увесь астатні час, калі верыць прадстаўленым ім бюлетэням, ён хварэў.

Гэтага нельга было б выключаць, калі б Згарбі амаль кожны дзень не прымаў удзел у самых розных тэлевізійных перадачах, шоў, адкрыцці выставак у Італіі і за мяжой, прэс-канферэнцыях, прэзентацыі кніг і г. д.

Усе гэтыя выступленні добра аплачваюцца, аднак у мітусні «левых» спраў Згарбі не забываў кантраляваць, каб і зарплата з дэпартамента своечасова пераводзілася на яго рахунак.

Суд, які разбіраў справу Згарбі, пастанавіў, што ён павінен вярнуць у дзяржаўную казну 12 мільёнаў лір, хоць пракурор настойваў на штрафе ў 38 мільёнаў лір.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

● Два тыдні назад М. Гарбачоў падзяліўся сваімі думкамі аб канцы камунізму на старонках італьянскай газеты «Стампа». Тая ж калонка будзе надрукавана ў газеце «Нью-Йорк таймс». Былы прэзідэнт СССР будзе пісаць для «Стампы» ў сярэднім ад 10 да 15 матэрыялаў у год. Газета будзе іх таксама прапаноўваць іншым выданням. Тэмы публікацый Гарбачова: яго адносіны з Б. Ельцыным, адносіны паміж Крамлём і Ватыканам і іншыя. Для распаўсюджвання артыкулаў Гарбачова за межамі Еўропы «Стампа» звярнулася ў газету «Нью-Йорк таймс». У Амерыцы лічаць, што калонкі Гарбачова будуць карыстацца вялікай папулярнасцю. Памеры ганарараў Гарбачова захоўваюцца ў сакрэце.

● Прэзідэнт Буш абвінаваціў лідэраў дэмакратаў у кангрэсе ў тым, што яны адмаўляюцца без прамаруджвання вынесці на галасаванне яго план умацавання эканомікі. Ён сказаў, што дэмакраты ставяць інтарэсы партыі вышэй за свае абавязкі, увесь час яны сакрэтнічалі за зачыненымі дзвярамі. План Буша, у прыватнасці, прадугледжвае падатковыя льготы для тых, хто ўпершыню набывае ўласны дом.

● Рашэнне Канады прадаставіць крэдыты Украіне мае вялікае значэнне. Бо самыя развітыя краіны Захаду, да якіх адносіцца і Канада, раней прытрымліваліся агульнай палітыкі адносна Украіны: яна павінна выплаціць сваю долю знешняй запазычанасці СССР, інакш грошай ад Захаду не атрымае. Канада парушыла гэта правіла, відаць, у выніку нейкіх закулісных дзеянняў. У Канадзе зараз жыве мільён украінцаў.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ

● Адна з мэт вайны ЗША супраць Ірака — фізічнае знішчэнне С. Хусейна — не была дасягнута. Таму Буш спрабуе яшчэ раз «дастаць» іракскага дыктатара, бо яго існаванне азмрочвае Бушу перадвыбарную кампанію.

ЗША вельмі заклапочаны спробамі Сірыі папоўніць свае арсеналы ракетамі «СКАД», якія ёй прадае Паўночная Карэя.

● Летась у Іране працягваліся грубыя парушэнні правоў чалавека. Улада іранскага ўрада па-ранейшаму трымаецца на арыштах, хуткіх судах і пакараннях смерцю, іншых рэпрэсіях службы бяспекі. Шырока выкарыстоўваюцца ў турмах катаванні.

РАДЫЁ «СВАБОДА»

● Ветэран праваахоўнага руху ў СССР А. Бонар падвергла крытыцы маскоўскія ўлады за тое, што яны дапусцілі сутыкненне ў мінулую нядзелю пракамуністычных дэманстрантаў з сіламі бяспекі. Ад 10 да 15 тысяч чалавек спрабавалі прарвацца праз міліцэйскія заслоны ў Крэмль. Некаторыя з іх, у тым ліку і пенсіянеры, атрымалі цялесныя пашкоджанні. Бонар крытыкуе мэра Масквы Папова за забарону дэманстрацыі. На яе думку, трэба было дазволіць дэманстрацыю прыхільнікаў камунізму на Манежнай плошчы.

● У Санкт-Пецярбургу шырацца пратэсты грамадскасці супраць прызначэння В. Бальшакова пракурорам горада. Ён у 80-х гадах актыўна выступаў абвінаваўцам на палітычных працэсах, разам з КДБ удзельнічаў у расправах над іншадумцамі. На судах, у час так званага застою, Бальшакоў дабіваўся максімальна суровых прыгавораў дысідэнтам.

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

● Немцы зацікаўлены ў актыўным супрацоўніцтве з краінамі СНД у галіне лёгкай прамысловасці, гатовы пастаўляць туды матэрыялы, выкрайкі. Тлумачыцца гэта тым, што ў Германіі за гадзіну працы трэба плаціць значна больш, чым савецкаму рабочаму, акрамя таго выплачваць сацыяльныя страхоўкі. Ды і наогул, рабочы дзень немца меншы, чым у СНД.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ

В. КЕБІЧ АБ СІТУАЦЫІ Ў ЭКАНОМІЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Адбудуцца змены ў падатковай палітыцы. Пэўна, знізяцца падаткі на дабаўлены кошт на дзіцячае адзенне, якое будзе прадавацца ў рэспубліцы.

Аднак, канстатаваў Старшыня Саўміна, «бюджэт рэспублікі трашчыць па ўсіх швах». Шмат сродкаў забіраюць велізарныя датацыі для падтрымання параўнаўча нізкіх цэн на мяса. Мільярды рублёў ідуць на ўтрыманне арміі, войск Міністэрства ўнутраных спраў, пагранічных сіл, мытні, якія раней фінансаваў саюзны цэнтр. Сёння трэба шчыра сказаць, што Беларусь, па сутнасці, застаецца з чарнобыльскай бядой сам-насам. Значна ўскладніў сітуацыю дзесяціразовы рост цэн на будаўніцтва.

Лейтматывам выступлення В. Кебіча гучала думка: трэба перш за ўсё разлічваць на свае ўласныя сілы, прадпрымальнасць, вынаходлівасць, а не атакоўваць Саўмін просьбамі аб фінансавай і матэрыяльнай дапамозе. Што, дарэчы, назіраецца з боку часткі кіраўнікоў прадпрыемстваў абароннага комплексу былога саюзнага падпарадкавання. Не енчыць трэба, не скардзіцца на цяжкія абставіны, а хутчэй пераходзіць на выпуск тавараў шырокага ўжытку, грамадзянскай прадукцыі для жыхароў Беларусі.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Мадонна: «Хачу дзіця»

Суперзорка Мадонна заплаціла кругленькую суму ў 8 мільёнаў долараў за шыкоўную вілу, выкананую ў французскім стылі і размешчаную высока на Галівудскіх узгорках. На жаль, дагэтуль няма нікога, хто раздзяліў бы яе з гаспадыняй.

Рок-каралева і мультымільянерка будзе жыць адна ў 21-пакаёвай віле, на ўласным узгорку з ашаламляльным відам на Галівуд. Усяго адзін кіламетр аддзяляе яе апартаменты ад асабістай музычнай студыі.

Мадонна, якая, як кажуць, мае ўсё, прызнаецца, што безнадзейна шукае сапраўднае каханне і магчымасць мацярынства. І пакуль яе фільм «У пасцелі з Мадоннай» літаральна заграбае мільёны, яна спрабуе ўладкаваць сваё асабістае жыццё.

Крыху раней, у мінулым годзе, спявачка прайграла судовую справу сваім галівудскім суседзям, якія паскардзіліся, што дрэвы вакол яе тагачаснага (коштам 6 мільёнаў долараў) дома псуюць ім від. Яна была так разгневана рашэннем суда, што набыла... новую 21-пакаёвую вілу.

Па галівудскіх мерках набытая Мадоннай віла (дарэчы, пабудаваная ў свой час для Грэты Гарба) лічыцца ўдалай пакупкай. Купленая ў збанкрутаванага лос-анджэлескага прадзюсера, у лепшы час яна магла б пацягнуць на рынку больш за 12 мільёнаў долараў. Заўважым, што «багатая дзяўчынка» мяркуе ў будучым патраціць яшчэ два мільёны долараў на пераабсталяванне дома ў італьянскім стылі.

Пакуль жа Мадонна, падобна, з'яўляецца прадметам зайздрасці для мільёнаў, сама ж яна зайздросціць толькі аднаму чалавеку — актрысе Робін Райт, сяброўцы свайго былога мужа Шона Пена. Робін падарыла яму тое, чаго не здолела Мадонна, — дзіця. Дылану Фрэнсісу Пену ў красавіку споўніцца год.

Нягледзячы на тое, што толькі за апошнія некалькі гадоў «зорка» зарабіла амаль 150 мільёнаў долараў, ёй не дае спакою толькі адно — нязбытнасць мацярынства. Для Мадонны было трагедыяй, калі пазалетась у яе здарыўся выкідыш — бацькам дзіцяці павінен быў стаць тагачасны палюбоўнік Тоні Уорд.

— Я жадаю мець дзяцей, — гаворыць яна, — і хацела б быць замужам, каб для іх выхавання былі неабходныя ўмовы. Для мяне мацярынства — літаральна неадчэпная ідэя, таму што ў самой не было маці (яе маці памерла, калі дзяўчынцы было 6 гадоў). Я ніколі не ставілася да людзей, з якімі працую і да якіх інстынктыўна цягнуся, як да людзей, што маюць патрэбу ў мацярынскім клопаце.

«Зорка» шоу-бізнесу, дарэчы, не мае недахвату ў паклонніках. Пасля Шона Пена ў яе была кароткая і лёгкая сувязь з партнёрам па фільму «Дзік Трэйсі» Уорэнам Біці, які сёння са сваёй сяброўкай Анет Бенінг — вы адгадалі! — чакаюць дзіця.

Алек Кешыш'ян, малады і энергічны кінарэжысёр, які паставіў яе апошні фільм, паводле слоў Мадонны, яе добры сябар, але не палюбоўнік.

«Агенцтва РІД» па матэрыялах замежнага друку.
Фота з часопіса «New idea».

Усё пра пасевы

З надыходам вясны перад агароднікамі паўстае адвечнае: калі сеяць, на якую глыбіню, з якой адлегласцю паміж радкамі і раслінамі і г. д. Кожнаму ж хочацца зрабіць як найлепш.

Тэрміны сяўбы для розных раслін свае. Спознішся, упусціш лепшы час — глеба падсохне і сілу набярэ пустазелле. Або пасееш кабачкі, гарбузы, фасолю — а тут мароз. Вядома, кволыя парасткі загінуць.

Прытрымлівацца трэба такога правіла: холадаўстойлівыя культуры сеяць раней (яшчэ ў красавіку), цеплалюбівыя — у другой палавіне мая, калі верагоднасць маразоў і рэзкіх пахаладанняў найменшая. Да першых адносяцца морква, кроп, гарох, пятрушка, радыска, буракі, цыбуля-чарнушка, салат; да цеплалюбівых — фасоля, гарбузы, кабачкі, памідоры, агуркі, перац, баклажаны. За выключэннем, бадай, фасолі, усе «пяшчотныя» культуры выспяваюць за сто і больш дзён. Таму іх мэтазгодна вырошчваць расадай.

А на якую глыбіню сеяць? Гэта залежыць ад размеру каліў: чым меншыя — тым мяльчэй. Англійскія селекцыянеры прапануюць і такі просты сродак: насенне ад верху глебы павінна быць загорнута на тры поўныя акружнасці каліў (вымярэнне па даўжэйшых баках).

Вось таблічка, якая дае яскравы адказ на многія астатнія пытанні, што звязаны з сяўбой:

Культура	Колькі грамаў насення сеяць на 10 м²	Адлегласць паміж стужкамі, радкамі (см)	Пасля канч. прарэджвання (см)	Глыбіня пасеву (см)
Морква, пятрушка, сельдэрэй	5 гр. з дабаўленнем 6 частак чыстага пяску	Дзве стужкі—40, радкамі—15 — 20	4	1,5—2
Фасоля	100—120	у адзін рад, паміж радамі — 40	10	3—5
Бабы	100—150	у адзін рад, паміж радамі — 40	12—15	4—5
Гарох	150—180	2-радковы, паміж радкамі — 40	4—5	3—5
Радыска	20—25	паміж стужкамі — 40, радкамі — 10	1—2	1—2
Рэдзька летняя	15—20	паміж стужкамі — 40, радкамі — 15—20	6	2—4
Рэдзька зімовая	5—6	тое самае	12—15	2—4
Рэпа	да 3	паміж радкамі — 15—20	6—7	1—1,5
Цыбуля-чарнушка на рэпку	10—12	паміж стужкамі — 40, радкамі — 15—20	4—5	1—2
Цыбуля-чарнушка на сявок	70—100	тое самае	Не прарэджваецца	1—2
Цыбуля-сявок	700—1500 (у залежнасці ад памераў цыбулін)	паміж стужкамі — 45 — 50, радкамі 25—30	Адлегласць 8—10	2—3 ад сухой шыйкі
Кроп	25	паміж радкамі — 10 —15	не прарэджваецца	1—2
Агуркі	6—8	паміж радкамі 60	15—30	2—4
Буракі	10—15	паміж радкамі 35—40	8—10	2—4
Кабачкі	4	квадраты 75×75		3—5

ВАШ САД І АГАРОД

Чаруем над цыбуляй

Апошнім часам людзей у магазінах «Насенне» найбольш цікавіць, ці будзе цыбуля-сявок. Гэтыя маленькія цыбулінкі сталі найвялікшым дэфіцытам.

Раней пасадачны матэрыял паступаў з ГДР і Румыніі. Там яго вырошчвалі выключна ўмела. Ды і кліматычныя ўмовы адметныя: шмат сонца і цяпла. Каб атрымаць маленькую якасную цыбулінку (яе дыяметр ад аднаго да 2,5 сантыметра), патрэбны чатыры цёплыя месяцы! Селекцыянеры рэспублікі вынеслі вердыкт: у Беларусі такія выключныя ўмовы — рэдкасць. А таму закупляць сявок трэба ў цёплых паўднёвых краях.

Крыху закупілі. Аднак патрэбнасці значна большыя...

Але ці ўсё так безнадзейна? На шчасце, не. І ва ўмовах нашай рэспублікі многага можна дасягнуць, калі праявіць стараннасць і крыху вынаходлівасці.

Па-першае, ёсць прыклады таго, што на поўдні Беларусі ўсё ж расце гэты капрыза-сявок! Па-другое, у сярэдняй і паўночнай частках выратоўвае... расада. Па-трэцяе, цыбулю-выбарак (яе дыяметр да 4 сантыметраў) нават у Пухавіцкім раёне вырошчвалі з чарнушкі.

Адно трэба памятаць: ураджай, атрыманы з насення ці расады, доўга захоўвацца не будзе. Яго абавязкова адолеюць хваробы. Лепшыя і самыя здаровыя экземпляры трэба выкарыстаць да сакавіка ці адразу перапрацаваць.

РАСАДА

Вырошчванне ў многім падобнае на механіку вырошчвання памідораў. Яе ўзрост—да 60 дзён. Пікіроўка не праводзіцца.

У скрынку з-пад вінаграду, папярэдне высланую плёнкай (каб не папсаваць падаконнікі), насыпаецца глеба. Найлепш падыходзіць «Дзвіна». Можна выкарыстаць сваю, што нарыхтоўвалі для памідораў. Толькі дадаць крыху больш пяску ці дробнага абясшкоджанага пілавіння. Увесь састаў патрымаць да 20 мінут у духоўцы, каб яна «паварылася». Астудзіць, паліць адфільтраванай снегавой вадой.

Вось такую глебу і загрузіць слоем у 10—15 см у скрынку, на дно якой пакласці драўнінны (пажадана бярозавы) вугаль, некалькі жоўтых манет. Праз пяць сантыметраў зрабіць радочкі і прыкатаць іх.

РЫХТУЕМ НАСЕННЕ

Паралельна з глебай рыхтуецца насенне. У гатаванай і адстоенай вадзе адсартаваць самыя важкія калівы (яны тонуць). Тыя, што ўсплываюць, для сяўбы непрыдатныя.

У чыстай вільготнай анучцы ці марлі апусціць адабранае насенне (па чарзе) у раствор марганцоўкі (светла-малінавы колер) на 15—20 мінут і прамыць снежнай вадой; пакінуць на двое сутак у растворы попелу (паўшклянкі на літр, настойваць да трох-чатырох сутак, перамешваючы, зліць з асадку). Пасля ў гэтай жа анучцы прарошчваць насенне на вільготным лямцы пры пакаёвай тэмпературы. Як толькі праклюнуцца парасткі ў дзесяці-дваццаці калівах, падсушыць ля батарэі да сыпучасці і пасеяць.

Радочкі ў глебе, якія мы загадзя падрыхтавалі і прыкаталі, дадаткова паліць (у сухой глебе насенне загіне), высяваць, імкнучыся, каб адно семя ад другога было на адлегласці хоць бы 0,3 сантыметра. Прысыпаць зямлёй, перамяшанай з пяском (роўныя часткі) ці пілавіннем з зямлёй. Глыбіня «залягання» насення, як у морквы — 1,2—1,5 сантыметра. Прыкатаць (атрымаюцца больш роўныя і дружныя ўсходы), паліць, накрыць плёнкай і паставіць у цёмнае месца. На працягу тыдня з'явяцца парасткі. Тады скрыначку вынесці на самы светлы падаконнік.

У першыя пяць дзён тэмпература павінна быць невысокая: удзень большая, уначы — меншая (не вышэй 10 градусаў). Затым днём—да 18, уначы—да 10—12 градусаў. Праз кожныя 2—3 дні (магчыма і часцей) глебу паліваць дожджыкам на дастатковую глыбіню. Даць да трох падкормак: у літры гатаванай вады раствараць 2 г аміячнай салетры, 4—суперфасфату, 2—калію. Першая падкормка—праз дзесяць дзён пасля з'яўлення ўсходаў. другая і трэцяя — праз два тыдні.

Як толькі дазволяць умовы (сонечнае надвор'е, плюсавая тэмпература), расаду трэба выносіць на балкон ці на ўчастак, каб прывыкала да натуральных умоў развіцця, загартоўвалася.

За 60 дзён расліны атрымліваюць добры «разбег», яны гатовы да высадкі на пастаяннае месца. Гэта адбываецца ў маі, у самым пачатку. Садзім радочкамі (адлегласць паміж імі ад 15 да 20 см). Адна расліна ад другой размяшчаецца на 5 сантыметраў. Вядома, глеба рыхлая, угноеная, нейтральная ці слаба-кіслая. Гной не свежы, а перапрэлы. Выбіраем расаду старанна (карэньчыкі не пашкоджваюць!). Ачышчаем іх і падразаем да 3—4 сантыметраў, акунаем у сумесь гліны і абясшкоджанага кампосту (роўныя часткі), адразу высаджваем. Глыбіня пасадкі — да 2—3 сантыметраў (крыху глыбей, чым у скрыньцы). Злёгку абціснем, асцярожна, каб не вымыць расліны, пальём. Толькі праз тры-чатыры дні больш інтэнсіўны паліў. А яшчэ праз чатыры дні — падкормка настоеным каравяком.

Далейшы догляд — палівы, падкормкі, рыхленні, апрацоўка раслін — 2—3 разы настоем часнаку, бардоскай сумессю паліхомам. Апошняя апрацоўка ў канцы ліпеня.

Такая цыбуля вырастае за чатыры месяцы—з мая па жнівень.

ПАДКАЗКА ЧЫТАЧА

Гэтак жа трэба гадаваць і сявок. Толькі насенне, якое прайшло ўсе стадыі адбору: абясшкоджванне, загартоўку і прарошчванне — кладзецца адразу ў самую сонечную і цёплую градку. Запомнім: толькі на сонцы можа сфарміравацца цыбулька. Не грэбаваць тымі ж прыёмамі агратэхнікі, своечасовымі і дбайнымі палівамі, падкормкамі, рыхленнем пасля кожнага паліву і дажджу, апрацоўка хімікатамі супраць розных хвароб, асабліва грыбковых.

Званкі і пісьмы чытачоў сведчаць, што, на жаль, няўдач пры вырошчванні сяўка больш, чым поспехаў. «Доўга не відаць раслін, а калі ўзыдуць, дык нейкія кволыя, — скардзяцца людзі. — Пройдзе тыдзень-другі, яны прападаюць».

Вось што рэкамендуе магіляўчанка П. Іванькова. Каб градка цыбулі-сяўка (а яшчэ і морквы, радыскі) была чыстай ад пустазелля, а самі расліны не хварэлі, яна робіць мінікастрышчы. Раскладвае на падрыхтаванай для пасеву пляцовачцы-градцы тонкім слоем сухое смецце, паперу, галінкі дрэў, салому, сена—і паліць. Выгада двайная: зямля атрымлівае ўгнаенне, а расліны — здаровую ад грыбкоў глебу. Вядома ж, процілажарная бяспека тут на першым плане.

Сцяблінкі сяўка такія кволыя, што, здаецца, іх нават вецер зломіць. А дождж з градам? Вось Іванькова і прыкрывае сваіх пестуноў плёнкай.

І, вядома ж, не чакае, пакуль нейкая бяда загубіць стрэлкі. Да чатырох разоў за сезон бярэцца за апрацоўку раслін. Выкарыстоўвае хлорвокіс медзі, калоідную серу, фундазол і паліхом. Дозы — на этыкетках прэпаратаў. Дзве апрацоўкі — другую і трэцюю—сумяшчае з некаранёвай падкормкай. Для гэтых мэт выкарыстоўвае каравяк і настой попелу.

А цяпер — пра сарты. Найбольш прыгодны для расады і для вырошчвання сяўка Каба. Падыдуць таксама Краснадарскі, Стрыгуноўскі, Сквірскі, Мячкаўскі, Данілаўскі, Белазёрскі, Штутгартэн. Апошні, аднак, вельмі капрызны.

«Узрост» расады

У апошніх чыслах лютага — пачатку сакавіка час падумаць пра расаду. Месца яе часовай дыслакацыі — падаконнік гарадской кватэры, цёплая веранда дачы ці такія ж светлыя сенцы сялянскіх дамоў (падаконнікі хат мала падыходзяць, бо яны невялікія, на іх мала святла), парнікі на біяпаліве.

Культура	Тэрмін пасеву на расаду	Узрост расады для высадкі ў адкрыты грунт ці пад плёнку (дзён)	Калі можна садзіць у агародную градку
Памідоры раннія	1.03—15.03	50—65	15.05—20.05
Памідоры для адкрытага грунту	15.03—25.03	50—60	20.05— 1.06
Белакачанная капуста (ранняя, каляровая, сярэдняспелая)	На дачы пад плёнку 25.03—15.04	35—45	15.05—20.05
Капуста белакачанная позняя	15.03—25.03	35—45	30.04—15.05
Цыбуля-чарнушка	5.03—10.03	60—65	5.05—10.05
Агуркі	10.04—20.04	25—30	Пад плёнку 10.05—20.05 пасля 15.05. у адкрыты грунт з укрыццём плёнкай пры пахаладаннях
Кабачкі, гарбузы, пацісоны	20.04—25.04	20—25	

ЧЫМ ЗАКРЫВАЦЬ РАДКІ?

У сельскай мясцовасці такіх пытанняў звычайна не ўзнікае. Засыпаюць канаўкі, дзе пасеяны правераныя калівы, той жа выбранай зямлёй. Дачнікі больш дасціпныя. Яны выкарыстоўваюць торф з пілавіннем ці рачны пясок, пясок з перагноем (у роўных частках.)

Калі няма блізка ракі, выкарыстоўваюць пясок з глыбокіх (да 1,5 см) ямаў. Там ён звычайна такі ж чысты, як і рачны. Лёгкая сумесь раслінай прабіваецца добра — што нож праз масла. У радку на першым часе не бывае пустазелля. А гэта — прастора для развіцця культурных парасткаў.

Яшчэ шмат дзе накрываюць градкі светлай ці цёмнай плёнкамі. Пад імі ствараецца выдатны мікраклімат. Усходы там з'яўляюцца на некалькі дзён раней, а самі расліны вельмі энергічныя і моцныя.

Падрыхтаваў Мікалай Чахоўскі (тэл. 32-41-92).

ЗАБЫТАЯ СЛАВА

Кароткі агляд ваеннай гісторыі Беларусі

(Працяг. Пачатак у №№ 34—38).

У 1772 годзе да Расіі адыходзіць Усходняя Беларусь.

З мэтаю ўзмацнення сацыяльна-палітычнага і эканамічнага становішча РП, а таксама, каб прадухіліць далейшыя магчымыя захопы тэрыторыі, Вялікі альбо 4-гадовы Сейм (1788—1792 гг) прыняў шэраг прагрэсіўных рашэнняў. Па сутнасці яны былі накіраваны на тое, каб вывесці РП з палітычнага крызісу і паставіць на шлях буржуазных рэформ. Найбольш яскрава гэтыя памкненні былі зафіксаваны ў Канстытуцыі 3 мая 1791 года. Скасаванне права «Libemur velo», адмена выбарнасці караля — цяпер трон перадаваўся ў спадчыну, павелічэнне правоў мяшчанства — усё гэта істотна абмяжоўвала правы «залатой шляхецкай вольнасці». Але згодна з Канстытуцыяй 3 мая пераставаў існаваць гістарычны падзел дзяржавы на Карону (Польшчу) і ВКЛ. Павінна была існаваць адна дзяржава — Рэч Паспалітая. За яе манархам захоўваўся толькі адзін тытул — «кароль польскі». Амбіцыі беларускага дваранства былі гэтым істотна зачэпленыя. Цэнтралізацыя ўлады ў РП занепакоіла і Расію.

У 1792 годзе Расія падтрымлівае частку беларуска-польскага магнацтва, якая аб'ядналася ў Таргавіцкую (ад назвы ўкраінскага мястэчка Таргавіцы) канфедэрацыю з мэтаю ліквідацыі рэфарматарскіх рашэнняў 4-гадовага Сейму. Пачынаецца кароткая (май—ліпень 1792 г.) вайна паміж Расіяй і РП. На тэрыторыі Беларусі адбыліся дзве найбольш буйныя бітвы: пад Мірам і Бярэсцем. Вайна скончылася паражэннем РП і прывяла да другога яе падзелу. Да Расіі адышлі беларускія землі прыкладна па лініі Друя—Пінск. Апошні, Гародзенскі (1793 г.) Сейм РП адмяніў Канстытуцыю 3 мая.

Рэч Паспалітая, неаднаразова падзеленая паміж варожымі суседзямі, у канцы XVIII стагоддзя апынулася перад магчымасцю свайго поўнага знікнення з палітычнай карты Еўропы. Аднак прагрэсіўныя колы афіцэрства, шляхты, святарства вырашаюць са зброяй у руках дабіцца сапраўднай незалежнасці, вярнуць страчаныя тэрыторыі і гонар зганьбаванай дзяржаве.

24 сакавіка 1794 года, з абвяшчэння ў Кракаве Акта паўстання, пачынаецца ўзброеная барацьба супраць захопнікаў пад лозунгам «воля, цэласць, незалежнасць». Узначальвае паўстанне генерал-лейтэнант Тадэвуш Касцюшка, па паходжанні беларускі шляхціч з-пад Бярэсця.

У сакавіку 1794 года да паўстання далучаецца Літва і Беларусь. 24 красавіка ў Вільні абвяшчаецца Акт паўстання ВКЛ.

У Вільні ж ствараецца напачатку асобны ад Кароны вышэйшы орган па кіраўніцтву паўстаннем — «Найвышэйшая Літоўская Рада». Галоўную ролю ў падрыхтоўцы паўстання і на яго пачатку адыгрываў Якуб Ясінскі, палкоўнік «літоўскага корпуса інжынераў». Ён быў прызначаны Радай галоўнакамандуючым літоўскім войскам. Пад яго кіраўніцтвам адбыўся захоп расійскага гарнізона ў Вільні (у ноч з 22-га на 23-е красавіка), а таксама бітвы з расейцамі на Віленшчыне пад Немянчынам і Палянамі, на Ашмяншчыне пад Соламі. У гэтых бітвах прынялі ўдзел беларускія сяляне-касінеры, узброеныя асаджанымі як дзіды косамі.

Вядомы ваенны дзеяч мінулага гетман Канстанцін АСТРОЖСКІ.

Характэрным для паўстання на Беларусі было ўжыванне партызанскіх (дыверсійных) формаў барацьбы (як і ў сярэдзіне XVII ст.) з расійскімі захопнікамі. Першая спроба дыверсійнага рэйду на Меншчыну была прадпрынята ў маі пад кіраўніцтвам былога падскарбія літоўскага Міхаіла Клеафаса Агінскага. Потым у жніўні Сцяпан (Стэфан) Грабоўскі з 2-тысячным атрадам робіць рэйд з-пад Вільні да Бабруйска, наводзячы паніку на расійскія гарнізоны. Прыкладна ў гэты ж час у другі раз М. Клеафас Агінскі непакоіць тылы расійскай арміі. Частка яго атрада, значную долю якога складалі касінеры, даходзіць да Дынабургу, спальвае яго прадмесце. Але пасля страты Вільні (12 жніўня) касцюшкаўскае паўстанне на Беларусі ідзе на спад. Пасля паражэння літоўска-польскага корпуса генерала Серакоўскага спачатку пад в. Крупчыцы каля Кобрына (16.IX), а на наступны дзень — пад Бярэсцем і адыходу рэштак літоўскага войска з-пад Гародні баявыя дзеянні пераносяцца на тэрыторыю Польшчы.

Спрэчкі паміж Варшавай і Вільняй аб кіраўніцтве паўстаннем у ВКЛ, адсутнасць адзінага і дасведчанага камандавання ім на Беларусі, частая яго змена, разнароднасць інтарэсаў шляхты і сялянства — усё гэта не магло не выклікаць яго паражэнне. Простаму беларускаму селяніну, касінеру, гараджаніну ці збяднеламу шляхцічу прапаноўвалі біцца за інтарэсы блізкай, але не сваёй, а «чужой Бацькаўшчыны». Сваю ж яшчэ трэба было знайсці і ўсвядоміць, каб потым біцца толькі за яе, не хочучы ніякай іншай. Усведамленне гэтага прыйдзе да лепшых сыноў Беларусі ўжо толькі ў XIX стагоддзі.

Апошнім сумным акордам XVIII стагоддзя стаў трэці падзел Рэчы Паспалітай 1795 года. Цяпер ужо ўсе беларускія землі былі праглынуты Расійскай імперыяй.

VIII.

Уключаная ў склад Расійскай імперыі, Беларусь хутка перажыла новае ваеннае спустошэнне. У 1812 годзе яна стала тэатрам знішчальнай вайны французскай арміі Напалеона супраць Расіі. Дзесяткі тысяч беларусаў былі рэкрутаваны ў расійскія палкі, аднак частка насельніцтва, кіруючыся прынцыпам «вораг майго ворага — мой прыяцель» і спадзеючыся на адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага, падтрымалі Напалеона. Летам 1812 года тут утварыліся свае ўзброеныя сілы ў дапамогу французам — 4 палкі конніцы і 5 палкоў пяхоты. Іх мабілізацыяй займаўся Вайсковы Камітэт, у які ўваходзілі Ігнат Тышкевіч, Аляксандр Хадкевіч, Аляксандр Пацей, Павел Сапега ды іншыя вядомыя людзі краіны. Прайграўшы кампанію, французы адступалі ізноў праз Беларусь, — спустошаны і выпалены край, жыхары якога паміралі ад тыфусу, цынгі і халеры. Беларускія сяляне, якія пакутавалі найбольш, уздымалі бунты, аднак царскі ўрад жорстка расправіўся з імі.

У лістападзе 1830 г. у Польшчы пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне. У красавіку 1831 г. яно ахапіла Заходнюю Беларусь (Ашмянскі, Свянцянскі, Браслаўскі паветы Віленскай губерні, Вілейскі і Дзісненскі паветы Мінскай губерні). Атрады налічвалі па 200—300 чалавек, некаторыя да 1 тысячы і больш. У іх склад уваходзілі прадстаўнікі польскага, а таксама паланізаванага беларускага дваранства, каталіцкае і уніяцкае духавенства, сяляне, якія спачатку прымкнулі да паўстання, але, бачачы, што кіраўніцтва апошняга не ставіць у сваёй праграме адмены прыгоннага права, адышлі ад барацьбы.

Павятовыя паўстанцкія ўрады аб'яўлялі рэкруцкія наборы ў паўстанцкае войска. Так, у Вілейскім павеце кожныя пяць душ мужчынскага полу павінны былі паставіць аднаго пехацінца, узброенага «стрэльбай, пікай, касой ці сякерай» і добра абмундзіраванага, а кожныя 20 душ — аднаго кавалерыста з дзідай. Кожны шляхціцкі двор павінен быў паставіць аднаго ўзброенага кавалерыста. Толькі ў Свянцянскім і Вілейскім паветах меркавалася стварыць 15-тысячнае войска.

У Віленскай і Мінскай губернях з-за няўзгодненасці дзеянняў паўстанцкіх атрадаў, адсутнасці адзінага камандавання паўстанне ў канцы мая 1831 г. прыйшло ў заняпад. Дробныя паўстанцкія атрады былі разбіты, шмат паўстанцаў забіта, паранена, узята ў палон, шмат дэзерціравалі.

У Гарадзенскай губерні паўстанне пачалося пазней, чым у Віленскай і Мінскай. Тут у раёне Белавежскай пушчы дзейнічаў атрад колькасцю каля 1 тысячы чалавек. Яго кіраўнікамі былі сакратар Гародзенскага грамадзянскага губернатара Красоўскі, кіраўнік дваранства Брэсцкага павету Нямцэвіч, кіраўнік дваранства Бельскага павету Белгарайскі, галоўны ляснічы Белавежскай пушчы Ранко, памешчыкі Незабытоўскі, Біалапіатровіч, Жылінскі і інш. Ужо ў першыя дні паўстанцы Гародзенскай губерні захапілі шмат рускіх транспартаў і сур'ёзна пашкодзілі сувязь рускай арміі з тылам.

У Навагродскім павеце дзейнічаў паўстанцкі атрад (400 чал.) пад кіраўніцтвам павятовага кіраўніка дваранства І. Кашпца. Аднак ён хутка быў разбіты ўрадавымі войскамі.

Летам 1831 г. каля Вільні адбыўся рашучы бой паміж паўстанцамі Літвы, Беларусі і Польшчы і царскімі войскамі. Паўстанцкія атрады, якія не мелі адзінага кіраўніцтва, добрай зброі, былі разбіты.

Ва Усходняй Беларусі (Магілёўскай і Віцебскай губернях), дзе быў значна меншы працэнт каталікоў, чым у Заходняй Беларусі, паўстанцкі рух не набыў значных маштабаў.

(Працяг будзе).

ШАХМАТЫ

(Заканчэнне. Пачатак у № 32).

ВЫНІКІ ГАДАВОГА КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ

ІІ месца—У. Іванову (Навапалацк).

Белыя: Крb7, Фb1, Лg5, Лh6, Cf2, Cg8, Кb2, Ke6, пп: a4, d2, e3, g3 (12).

Чорныя: Крd5, Фb4, Лa3, Лa5, Ce5, Cf6, Кb8, пп: a7, b6, d3, d4, d6, f3, g2 (14).

Мат за 4 хады.

1. Фс1! ~ 2. Кс5+ Се6 3. С:е6+ 1... Лс3 2. Кс5+ Кр:с5 3. ed+,

1...Фс3 2. е4+ С:е4 3. К:d4+

Цікавая гульня батарэй са звязкай чорных фігур, але белая ладдзя h6, можна сказаць, не дзейнічае.

Па раздзелу эцюдаў І месца —М. Храмцэвічу (Бабруйск).

Белыя: Крe2, Фd1, Лa3, п. b6 (4).

Чорныя: Крb4, Фe8, Лc6, Кb2, пп: c3, e6, e7, f7 (8).

Выйгрыш.

1. Фb3+ Крс5 2. Ф:с3+ Кс4! 3 Лa5+Кр:b6 4. Фb4+Крс7 5. Лa7+Крd8 6. Фb8+Лс7 7. Фb7! f6 8. Крe1! f5 9. Крf2 f4 10. Крe1 f3 11. Крf2 і выйгрыш.

ІІ месца—І. Бондару (Ганцавічы).

Белыя: Крa5, Лf4, Ke7, п. a4 (4).

Чорныя: Крb7, Cc8, Ce1, п. d2 (4).

Нічыя.

1. Лb4+Крa8! 2. Кd5 d1Ф 3. Кс7+Крa7 4. Кb5+Крb7 5. Кс3+Крс6 6. К:d1 Крс5 7. Кс3! С:с3—пат. (6...Ch3 7. Кf2 (Кb2) Cf1 8. Кd3! С:d3—пат).

ІІІ месца—А. Булаўкі (Клічаў)

Белыя: Крc6, Ke1, пп. b5, e7, g2, g5 (6).

Чорныя: Крh4, Ca5, Ch5, пп: f5, g3, g7 (6).

Выйгрыш.

1. g6! С:g6 2. Кf3+Крh5 3. Крd7 Крh6 4. Кe5 Ch5 5. Крe6 Ce8 6. Кf7+Крh7 7. Кd6 Ch5 8. Кf7 і выйгрыш.

У. СЫЧОЎ, суддзя рэспубліканскай катэгорыі.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Карнавал у Венецыі». Кінанарыс.
9.00. Беларуская мова. 1-ы клас
9.15. «Сёння і штодзень». Тэлефільм.
10.15. Процістаянне. Маральна прававая праграма.
11.15. «Ад і да». Тэлетаргі.
11.30. «На ўсё астатняе жыццё». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. Гісторыя Беларусі. 9-ы клас.
17.10. Творы Ф. Шапэна ў выкананні выхаванца музычнага ліцэя пры Белдзяржкансерваторыі Ю. Саргея і Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі.
17.50. «Лёгкі хлеб». Мультфільм.
18.00. «Дзень добры, фенікс» Дак. фільм.
18.20. «Пакуль любоў жыве, і ты жывеш...» Паэзія Нізамі Гянджаві.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый. «Тры рацыёны».
19.40. Эканамічная хваля. «Што маем — не цэнім...» Аб адносінах да прыродных рэсурсаў. Прамая лінія. У перапынку (20.25) — Калыханка.
21.00. Тэлебіржа.
21.20. «Канец вечнасці». Мастацкі фільм.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Канцэрт з твораў М. Будашкіна.
8.20. «Радзіме пакланіцеся...» Аб тургенеўскіх мясцінах Расіі.
9.25. «Час каморнікаў». 2-я серыя.
10.30. Дак. фільм «Анёл затрубіў...»
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Дак. фільм «Хаматэк» на шляху да рынку».
11.50. С. Танееў. Сімфонія № 2 сі-бемоль мажор.
12.25. Рытмічная гімнастыка.
12.55. «Дом над Акой».
13.25. Блакнот.
13.30. Вам гэта трэба?
13.45. Гандлёвы рад.
14.00. Навіны.
14.20. Дыхальная гімнастыка.
14.35. «Чалавек, які смяецца». Мастацкі фільм (Францыя). 1-я серыя.
15.50. Дзіцячы музычны клуб.
16.30. Разам з чэмпіёнамі.
16.45. Да міжнароднага тэлемарафона «Салдаты XX стагоддзя супраць вайны».
17.00. Навіны.
17.20. Вячэрні альбом.
18.00. Мультфільмы для дарослых.
18.10. Дасье.
18.40. «Час каморнікаў». 2-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Кінапанарама.
21.50. «Музычнае падвор'е». Забаўляльная праграма Аўстрыйскага тэлебачання.
23.00. Навіны.
23.20. Пяць плюс.
0.20. Тэніс. Кубак Расіі.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Французская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Дамашні клуб».
8.05. Французская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дзіцячая гадзіна з урокам нямецкай мовы.
9.35. Тэлевізійны фільм.
9.50. «Дар душы». Граф Т. М. Талстой-Міласлаўскі — Расіі.
10.35. Дак. фільмы «Кулунда: трывогі і надзеі». «Забароненыя песенькі».
11.25. Конны тэатр «Нарты».
12.25. «Дзелавое добрасуседства».
12.45. Сялянскае пытанне. Ці будзе сялянская прэса?
13.00. Весткі.
15.00. Восень жыцця.
15.15. «Адпачыванне». Канцэрт класічнай музыкі.
15.45. Прастора плюс.
16.15. «Мае справы—квітнеючыя паляны». Мастак М. Бяльковіч.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Версія.
17.25. Азы кар'еры.
17.40. Вольны час. «Дай лапу, сябар!»
17.55. «Хто ведае — вечнасць ці імгненне».
18.40. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Расійскае тэлебачанне і РІА ТБ прадстаўляюць...
22.00. Весткі.
22.25. Расійскае тэлебачанне і РІА ТБ прадстаўляюць...

26 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Песня жытнёвага поля». Дак. фільм.
9.00. Гісторыя Беларусі. 9-ы клас.
9.35. Ліра.
11.30. «На ўсё астатняе жыццё». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. Для дзяцей. «Лянівая прыгажуня». Тэлеспектакль.
17.05. «Раз каўбой, два каўбой». Мультфільм.
17.15. «Вяртанне». Тэленарыс.
18.00. Дзе выйсце з крызісу? Па слядах першай Асамблеі дзелавых кругоў Рэспублікі Беларусь.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. «Гонка без фінішу».
19.40. Мы едзем у Рыню... Падрыхтоўка ў Польшчы кадраў па прыватызацыі.
20.25. Калыханка.
20.45. Гандаль-дайджэст.
21.00. Аб партыях без дыпламатыі. «Новая Беларусь»: па чутках і з першых вуснаў.
21.20. «Чыста англійскае забойства». Мастацкі фільм. У перапынку (22.40) — НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.30. Дзіцячы музычны клуб.
8.10. Разам з чэмпіёнамі.
8.25. «Час каморнікаў». 3-я серыя.
9.45. Кінапанарама.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Штрыхі да партрэта». Дак. фільм.
12.05. Новыя імёны.
12.55. Як дабіцца поспеху.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. Сёння і тады.
14.50. «Чалавек, які смяецца». 2-я серыя.
16.00. Таленты і паклоннікі.
16.50. Да Міжнароднага тэлемарафона «Салдаты XX стагоддзя супраць вайны».
17.00. Навіны.
17.20. Чыя праўда, калі справядлівыя пароўну.
17.50. Я хачу ўбачыць музыку.
18.25. «Час каморнікаў». 3-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Дак. фільм. «Змрок свабоды».
21.30. Тэлевіктарына «Даходнае месца».
22.25. Мастак Таццяна Маўрына.
23.00. Навіны.
23.20. «Што азначаюць вашы імёны?» Забаўляльная праграма.
0.40. Тэніс. Кубак Расіі.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Пад знакам рыбы».
8.05. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
8.35. Хто косіць ноччу?
9.05. Залатая шпора.
10.05. Дак. фільмы «Алімпійскі прыцэл». «Хлопцы з нашага горада».
10.45. Да 120-годдзя з дня нараджэння А. М. Скрабіна.
11.15. Пятае кола.
13.00. Весткі.
15.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
16.00. Школа менеджэраў.
16.30. «За тых, хто не знайшоў спакою». М. Фейгін.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Далёкі Усход.
17.45. Эканом.
18.00. «Расійскі бізнесмен-91». Фінал.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Прашу слова.
19.45. «Футбол праз гады». Да юбілею М. П. Старасціна.
20.30. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.55. «Расійскі бізнесмен-91» (працяг).
22.00. Весткі.
22.25. Без рэтушы.
23.25. «Экзотыка». Музычная праграма.

РАДЫЁ

26 лютага

7.00 — «Радыёфакт». Ранішняя інфармацыйная праграма. 8.05 — «У Савеце Міністраў рэспублікі». Урадавая прэс-служба паведамляе... 8.15—«Дзелавы веснік». 9.15—«З трывогай і надзеяй». Да 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка У. Карпава. 10.15 — для дзяцей. «На лясной палянцы». 10.35—А. Платонаў. «Яшчэ мама». Інсцэніраванае апавяданне. 11.20 — «З літасцю да прыроды». Аб праблемах аховы навакольнага асяроддзя. 12.00 — «Апоўдні». 13.00 — «У абедзенны перапынак». Інфармацыйна-музычная праграма. 14.00 — «Выбраныя старонкі опернай музыкі Д. Вердзі». Канцэрт. 15.15 — канцэрт. 16.05 — «Мы едзем, едзем, едзем...». Музычна-забаўляльная праграма. 17.00—эстрадная праграма. 18.00—перадачы абласнога радыё. 19.00—гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — вячэрняя казка. 20.00 — «Дзень нашага жыцця». 20.25 — «У 5-й студыі, на Чырвонай». М. Карым. «У ноч зацьмення Месяца». Спектакль. 22.10 — вершы П. Макаля. 23.10 гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная».

НАДВОР'Е

25 лютага

Сёння ўдзень па рэспубліцы воблачнае з праясненнямі надвор'е, часам ападкі, раніцай на дарогах галалёдзіца, месцамі — туман. Тэмпература паветра ў Брэсце і Гродна — 4—6, у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі — 2—4 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак захаваецца цёплае надвор'е. 26 лютага на большай частцы тэрыторыі рэспублікі, 27-га — па поўначы ападкі. Тэмпература паветра ўначы ад 4 градусаў марозу да 1 градуса цяпла, удзень — 2—7 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: член рэдакцыйнай калегіі Уладзімір Гойтан, намеснік адказнага сакратара Яўген Ляхаў, старшы карэктар Ала Сабалеўская.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.784. Індэкс 63.850.
Зак. № 39.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.05.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12